PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2476) Год XLVIII | Беласток, 26 кастрычніка 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Будуць нас судзіць

Яўген Мірановіч

Нядаўна інфармавалі мы пра акцыю, якую ў нашай рэдакцыі праводзіла Беластоцкая дэлегатура Найвышэйшай кантрольнай палаты (НІК). Супрацоўнік НІК Роберт Скварко паўтара месяца шукаў слядоў небяспечнай для польскай дзяржаўнасці дзейнасці. У ліпені НІК выпусціў інфармацыю, якая беспамылкова трапіла ў беластоцкі „Кур'ер паранны", нібыта ў „Ніве" павышалі тыраж і кошт выпуску тыднёвіка, раздавалі талоны, а за два гады няправільна расходавалі 174 тысячы злотых. НІК паінфармаваў таксама прэсу, што справу накіруе на разгляд у пракуратуру. З неафіцыйных крыніц вядома, што матэрыялы з кантролю НІКу асабіста пастаўляў журналісту газеты пасол адной з мясцовых нацыяналістычных груповак. У польскіх беластоцкіх сродках масавай інфармацыі, а асабліва ў тэлебачанні, з вялікай заангажаванасцю і задавальненнем інфармавалі аб блізкім канцы нашага тыднёвіка. Адчувалася еднасць мясцовага „братняга народу" ў справе „Нівы".

Дырэктар Беластоцкай дэлегатуры НІК Антоні Янухта тым часам слаў нам пісьмы, са зместу якіх вынікала, што мы ў адказ павінны дакладна прадставіць Міністэрству культуры свае выдаткі. Бухгалтарка амаль цэлыя канікулы састаўляла табліцы, пералічвала сумы з тысячаў дакументаў. Нічога не бракавала. Інфармацыю пасылалі мы ў Міністэрства і Беластоцкую дэлегатуру НІК. З Міністэрства прыйшоў станоўчы адказ, адабраючы нашы справаздачы. Начальнікам дэлегатуры стала зразумелым, што такім шляхам не ўдасца закрыць наш тыднёвік. Вырашылі тады накіраваць абвінавачанне супраць мяне і нашай бухгалтаркі ў пракуратуру.

Абвінавачваюць нас, што бухгалтарка не мае адпаведных сертыфікатаў займацца рахункаводствам, хаця займаецца ім каля трыццаці гадоў. Рахунковая кніжка знаходзілася не ў рэдакцыі, а ў доме бухгалтаркі, за што кіраўніку выдавецтва пагражае да двух гадоў зняволення. Напамінае пра гэта пракурору дырэктар Беластоцкай дэлегатуры НІК А. Янухта. Відаць, баіцца, што пракурор можа дамагацца ў судзе меншай кары. Амаль на 8 старонках апісаны парушэнні законаў у справе тэхнікі бухгалтэрыі і каля 30 паасобных выпадкаў антыдзяржаўнай дзейнасці, у выглядзе незаконнага выдаткавання датацыі.

Дырэктар Янухта абвінавачвае нас, між іншым, у тым, што складаючы ў Міністэрства культуры дакументы мы павысілі сярэдні тыраж да 2 200 экземпляраў, хаця паводле падлікаў супрацоўніка НІК Роберта Скваркі склаў ён 1 570

[працяг ☞ 2]

Фота РАМАНА ВАСІЛЮКА

Чэргі з мяжы перанесліся пад польскае консульства ў Гродне

Краявід з візамі

Мікола Ваўранюк

Вернуцца ці не? Ужо трэці тыдзень з такім пытаннем засынаюць і прачынаюцца тыя жыхары Падляшша, якія жылі з гандлю з прыезджымі з усходу. Пасля ўводу віз па пустых базарах адно вецер гоніць асенняе лістоўе.

— Тут рускіх машын было поўна, — Рамуальд Рафальскі, абаперты спіною аб мур царквы ў цэнтры Саколкі, вядзе рукою паўкруг па вялікім пляцы, — а цяпер што? Пуста. Адно пару нашых.

Не відаць эйфарыі ў медыях, якія час ад часу ўздымалі дзяжурную тэму: рускія гандлююць таннымі цыгарэтамі і спіртам. Такая сітуацыя магла б цешыць уласнікаў крамаў. Магла б... але не цешыць.

— Цешыцца няма з чаго, — сумнавата ўсміхаецца Ядвіга Біркас, кіраўнік ГСаўскай крамы ў Саколцы. — Абарот куды меншы, тавар залежваецца. Беларусы не толькі прадавалі, але і куплялі.

Ці візы знеахвоцілі грамадзян Беларусі прыязджаць у Польшчу? Кантрольна-прапускны пункт на мяжы ў Кузніцы быццам пацвярджаў гэта. Усяго некалькі аўтамабіляў. Куды дзеліся чэргі, у якіх трэба было стаяць па двое-трое сутак?

Чэргі ёсць, адно ў іншым месцы. Пад Генеральным консульствам Рэчы Паспалітай Польскай у Гродне. Цяпер тут трэба дняваць і начаваць, каб атрымаць неабходны штамп у пашпарт.

— Чацвер, пятніца, субота, нядзеля, — лічыць мне ў панядзелак Галіна Крылова з Ліды, — а пэўна яшчэ і сёння не ўвойдзем усярэдзіну.

Гарадзенец Пётр Казлоўскі таксама не ведае, калі стане перад абліччам консула:

— Узнікла ўжо тут некалькі спіскаў, — разводзіць рукі. — Я быў спрабаваў праз Саюз палякаў Беларусі, але там таксама не спраўляюцца з усімі жадаючымі і ў бліжэйшы тыдзень ніякіх дакументаў прымаць не будуць.

Не заставалася нічога іншага, толькі стаяць на вуліцы Фрунзе, у натоўпе, перад якім толькі зрэдчас адчынялася жалезная брама. Ішоў дождж.

— Ці ж не можна было гэта ўсё інакш арганізаваць? — пытаецца Святлана Петухова з Дзятлава. — Людзей больш прыняць на працу ў консульстве ці што? Чакаць тут тыдзень, гэта кашмар!

Консул Януш Дамброўскі пераконвае, што Генеральнае консульства РП у Гродне зрабіла ўсё магчымае, каб падрыхтавацца да ўвядзення візавага рэжыму:

— Правялі мы генеральны рамонт памяшканняў, паставілі новую камп'ютэрную тэхніку, павялічылі персанал. У візавым аддзяленні працуе цяпер пятнаццаць чалавек.

Удзень выдаюць яны каля трохсот візаў. Натоўп за брамай, на вока, тры разы большы.

— Не думаю, каб зацікаўленне польскімі візамі ў бліжэйшы час паменшала, — кажа консул Януш Дамброўскі. — Польшча цікавая не толькі з турыстычнага пункту погляду. Многа асоб з Гродзеншчыны ў нас штудзіруе, многія працаўнікі тутэйшых вышэйшых школ выкладаюць у польскіх універсітэтах. Ну і многа людзей мае ў Польшчы сем'і.

У чарзе пад консульствам калі не ўсе, дык прынамсі дзве трэці дэкларуюць польскую нацыянальнасць. І абураюцца, як гэта так, што Польшча адвярнулася

[працяг ☞ 2]

Аб беларусах таго і іншага палёту ☞ 3

„Няма свабоды без меншасцей. Нашы беларусы", — пад такім лозунгам Сакрат Яновіч прамовіў у дакладзе на ўрачыстым адкрыцці чарговага акадэмічнага года ў беластоцкай Вышэйшай школе публічнай адміністрацыі. Гэтая непублічная вучэльня прыняла ў гэтым годзе больш за паўтары тысячы студэнтаў.

З камітэта ў таварыства ☞ 4

Арганізатары сходу прапанавалі змяніць назву арганізацыі з Грамадскага камітэта будовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы на Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" і абмеркаваць праект змяненняў у статуце арганізацыі. Сабраныя выбралі новую ўправу з 15 асоб і рэвізійную камісію з 5 асоб (у новыя ўлады не трапілі ні Ян Хіліманюк, ні Віктар Бура).

Асвета на павароце ☞ 5

На 1 001 беспрацоўнага настаўніка зарэгістраваных у Ваяводскай управе працы было толькі 166 прапаноў. Найбольшае беспрацоўе ў паўночна-заходніх гмінах (Монькі 11%), найменшае ў Сямятыцкім павеце — 7%. Сярэдняя краіны — 14 працэнтаў. Сярод беспрацоўных, найбольш паланістаў і гісторыкаў.

Любоў да мясцовага ☞ 8

Галоўны рэдактар „Картак" Багдан Дудко адзначыў, што абедзве кніжкі — „Вершы тутэйшыя" Міраславы Лукшы і „Расказы з-над Нарвы" Міраслава Грыкі — прасякнуты любоўю да мясцовага і тутэйшага. Гайнавяне дашукаліся ў прэзентаваных творах многіх элементаў звязаных з Гайнаўшчынай.

Шляхта на агародзе ☞ 9

Нашчадкі столінскай шляхты адрозніваюцца ад звычайных калгаснікаў і пралетараў. Наўрад, ці ў смак гэтае адрозненне падарожнікам. Бо Століншчына ў Рэспубліцы Беларусь вылучаецца тым, чым Арляншчына ў Польшчы, карацей — адсюль родам трэць усяго праваслаўнага духавенства.

Асфальт у Паўночным Востраве ☞ 11

І сапраўды, абнаўленне вулічнага насцілу адбываецца прыхваткава. Перад насцілам асфальтавага палотнішча з аднаго боку вуліцы кладуць бардзюры, а з другога — не. Бо на ўсё няма грошай.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Рахунак за недагляд выпіша нам гісторыя

Штодзённа „Газета выбарчая" і інфармацыйнае агенцтва ПАП закрылі свае карэспандэнцкія пункты ў Беларусі, тлумачачыся фінансавымі прычынамі. Гэтае рашэнне выклікае недаўменне, паколькі ў Беларусі закрываюцца незалежныя сродкі масавай інфармацыі і паступае манапалізацыя інфармацыйнай прасторы дзяржавай.

Вядомы беларускі публіцыст і пісьменнік Сямён Букчын лічыць, што закрыццё карпунктаў польскіх СМІ выглядае зусім лагічна. Ва ўмовах вострай канкурэнцыі на інфармацыйным рынку палякі не могуць сабе дазволіць на бясконцы аналіз экстравагантных жамчужынак мінскіх палітыкаў: як прадстаўнікоў улады, так і апазіцыі. А гэта ўжо становіцца зусім нецікавым. Паводле Букчына, актуальную інфармацыю аб Беларусі польскія СМІ могуць браць з інфармацыйных агенцтваў, у тым ліку расійскіх. Танна і сур'ёзна.

З такім пунктам гледжання не згаджаецца Беларуская асацыяцыя журналістаў. Паводле БАЖ, „Газета выбарчая" і ПАП былі тымі сусветнымі сродкамі масавай інфармацыі, пры дапамозе якіх рэпрэсаваныя журналісты і палітыкі маглі інфармаваць міжнародную супольнасць аб падзеях у Беларусі.

А вось каментарый на гэту тэму старшыні Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь Марціна Рэмбача:

„Палякі не могуць сабе дазволіць на бясконцы аналіз экстравагантных жамчужынак мінскіх палітыкаў", — гаворыць Сямён Букчын і не цяжка падзяліць яго думку, бо ўсё-такі не ўсе любяць тэатр абсурду. Аднак сітуацыю, у якой у самых важных польскіх СМІ няма журналістаў кампетэнтна займаючыхся Беларуссю, цяжка прызнаць нармальнай. Беларусь — гэта не толькі ўлады і апазіцыя, але 10 мільёнаў насельніцтва, якое непасрэдна мяжуе з Еўрапейскім Саюзам, народ блізкі нам па культуры, гісторыі, менталітэце. Беларусь — гэта таксама некалькі соцень тысяч палякаў, якія жывуць на складаным польска-беларускім і польска-літоўскім памежжы. Беларусь — гэта мільён грамадзян, якія штогод шматкратна прыязджаюць да нас з таварам і за таварам, штораз часцей з кніжкамі і за кніжкамі, з ведамі і за ведамі, з культурай і за культурай. Беларусь — гэта інтэлігенцыя і культура, у магутнай ступені накіраваная на Захад, шукаючая партнёрства ў Польшчы, часта ўлюбёная ў яе і яе ідэалізуючая. Гэта ўсё ж наша супольная гісторыя і памяць аб тым, што паважалі нас у Еўропе толькі тады, калі мы былі разам. І яшчэ адно (калі польскім дэмакратычным СМІ трэба прыпамінаць асноўныя рэчы): слова Беларусь абазначае сёння „грамадства ў патрэбе", так як калісьці для дэмакратычнага свету гэты тэрмін шчыльна быў звязаны з Польшчай. Ці тады заходнія свабодныя СМІ эканомілі на карэспандэнтах з Варшавы?

Усе далікатнасці, звязаныя з польска-беларускімі культурнымі, эканамічнымі, геапалітычнымі кантактамі нельга сумленна назіраць з Варшавы і Масквы. Таму лічу, што Сямён Букчын іранізуе, аргументуючы, што польскія СМІ могуць асвятляць падзеі ў Беларусі праз пасрэдніцтва расійскіх агенцтваў — танней і больш сур'ёзна. Сур'ёзна не будзе нават праз тыдзень, а наконт коштаў трэба сказаць, што рахунак выпіша нам гісторыя. Будзе ён нашмат нулёў вышэйшы, чым кошт утрымання карэспандэнтаў. І з'явіцца ён намнога хутчэй, чым хто-колечы ў Польшчы гэтага спядзяецца.

www.bialorus.pl

Будуць нас судзіць

[1 ☞ працяг]

экземпляраў. Такім чынам — піша шэф Беластоцкай дэлегатуры НІК — мы атрымалі павышаную датацыю. Піша гэта, трымаючы ў руках дакументы, з якіх вынікае, што ў 2002 г. прызнаная на падставе дасланых намі дакументаў датацыя была амаль на 40 працэнтаў ніжэйшая чым у 2001 годзе. НІК інфармуе пракуратуру, што двух журналістаў „Нівы" прыняло ўдзел у З'ездзе беларусаў свету ў Мінску і атрымалі зварот коштаў падарожжа, хаця не мела гэта нічога супольнага з выдаваннем газеты. Здаецца пяць разоў тлумачыў я супрацоўніку НІК Скварку, што з гэтага падарожжа журналісты прывезлі матэрыялы, якія публікаваліся ў „Ніве", але нікога такія аргументы не цікавілі. Абвінавачваюць нас таксама ў пакупцы паперы і каляровых алоўкаў з датацыі на варштаты „Зоркі" пасля заканчэння імпрэзы і кветак з нагоды юбілею аднаго з былых супрацоўнікаў рэдакцыі. Кантралёру НІК нідзе і нішто не згаджалася. Асабліва не спадабалася, што мы вялі выдавецкую дзейнасць выключна за кошт датацыі, а грошы з продажу „Нівы" адводзілі ў запас, які дазваляў выдаваць тыднёвік у першых месяцах кожнага года, пакуль не прыйшла новая датацыя. Згодна з законам, мы павінны дасланыя грошы з Міністэрства культуры і з продажу „Нівы" выдаткаваць да канца кастрычніка, а пасля — так вынікае з логікі НІК — спыніць выдаванне тыднёвіка. Пасля атрымання новай датацыі маглі б мы працягваць выдавецкую дзейнасць, напрыклад, пачынаючы з 1 красавіка. Не абазначае гэта аднак, што і тады не парушылі б мы нейкіх законаў. Усё тут трымаецца логікі сталінскага пракурора, які гаварыў: „Дайце мне чалавека, а параграф на яго знойдзецца".

На заканчэнне дакумента накіраванага ў пракуратуру дырэктар Беластоцкай дэлегатуры НІК А. Янухта піша: „celem działalności (злачыннай) obwinionych było gromadzenie środków na działalność Rady Programowej, a głównie na wydawanie tygodnika «Niwa»". А гэта ж асноўная мэта дзейнасці Праграмнай рады, запісаная ў статуце арганізацыі, зарэгістраванай у Беластоцкім ваяводскім судзе ў 1992 годзе. З таго часу шмат аднак памянялася. Для беластоцкіх „патрыётаў" выдаванне „Нівы" здаўна было злачынствам. Сёння прыйшоў час станаўлення „права і справядлівасці". У мяне надзея, што паспеем яшчэ апісаць у нашым тыднёвіку становішча ў гэтай справе беластоцкай пракуратуры і суда.

Яўген Мірановіч

Дзякую ўсім тым, якія ў час антыніўскай істэрыкі выказалі нам гатоўнасць свае падтрымкі.

Перагрупоўка сіл

Восьмы з'езд Таварыства беларускай мовы (ТБМ), што адбыўся 12 верасня ў Мінску ў многім адлюстраваў тую негатыўную моўную тэндэнцыю, якая складаецца з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Разам з тым, немагчыма сцвердзіць, што беларуская мова — мёртвая.

Само правядзенне з'езда аддавала нейкім напылам таямнічасці. Дакладна аб ягоным месцы напачатку ведала толькі невялікая колькасць людзей. Як паведаміў нязменны старшыня ТБМ Алег Трусаў, гэта было звязана з магчымасцю таго, што „прыйдзе пажарнік і знойдзе міну". Сэнс такога меркавання зразумелы — у цяперашніх беларускіх унутрыпалітычных умовах уладутрымаючым лёгка знайсці любую зачэпку, каб не даць магчымасці правесці тое ці іншае мерапрыемства. Асабліва мерапрыемства апазіцыйнай накіраванасці.

Таварыства беларускай мовы цяжка аднесці да нейкіх яскрава выражаных апазіцыйных арганізацый. Аднак, само прапагандаванне беларускай мовы да апошняга часу лічылася прызнакам нязгоды з палітыкай фактычнага выцяснення беларушчыны, якая і дагэтуль праводзіцца лукашэнкаўскай уладай.

Вынікам такога выцяснення стала практычнае знікненне беларускай мовы са сферы адукацыі. Аб гэтым ішла размова на з'ездзе. На сённяшні дзень у буйных гарадах амаль адсутнічаюць не толькі школы з беларускай мовай навучання, але нават цяжка знайсці беларускамоўны клас. Ужо вядомыя выпадкі, калі бацькі адмаўляліся пускаць сваіх дзяцей у рускамоўныя школы і класы, матывуючы гэта канстытуцыйным правам атрымліваць адукацыю на беларускай мове.

Сітуацыя з Беларускім нацыянальным гуманітарным ліцэем — яскравае адлюстраванне стаўлення ўлады да беларускамоўнага навучання. Няшчасныя навучэнцы і іх бацькі ў поўным аб'ёме адчулі на сабе нежаданне чыноўнікаў падпарадкоўвацца канстытуцыйным палажэнням, бо для апошніх больш важным застаецца выкананне волі начальства, няхай і несправядлівай. У выніку, заняткі праходзілі на вуліцы, а затым у выпадковых памяшканнях. Тут застаецца толькі падзівіцца маральнаму духу змагароў за беларушчыну — выкладчыкам і навучэнцам ліцэя.

Дагэтуль атрымаць беларускамоўную вышэйшую адукацыю ў Беларусі застаецца недасягальнай марай. Нягледзячы на намаганні ТБМ і прагрэсіўнай беларускай грамадскасці, чыноўнікі ад адукацыі працягваюць сцвярджаць, што стварацъ беларускамоўную вышэйшую навучальную ўстанову няма ніякай неабходнасці, бо ўсе астатнія, гэта значыць рускамоўныя, задавальняюць існуючыя патрэбы нацыянальнай гаспадаркі ва ўсіх без выключэння галінах. Зноў як у савецкія часы мэтазгоднасць, а дакладней погляды асобных персон, становяцца вышэйшыя за закон.

У той жа час на з'ездзе было засведчана, што актыўных носьбітаў беларускай мовы апошнім часам пабольшала. Рэлігійныя канфесіі такія як каталікі і пратэстанты ў параўнанні з іншымі больш паважна ставяцца да беларускай мовы і выкарыстоўваюць яе ў богаслужэннях. Мімаходзь заўважу, што даны з'езд праходзіў у тэатральнай зале мінскага касцёла святых Сымона і Алены, пробашч якога зноў абраны ў кіраўніцтва ТБМ. Беларускую праваслаўную царкву цяжка назваць флагманам у справе адраджэння беларускай мовы, але і там ёсць пэўныя пазітыўныя зрухі.

Цалкам верагодна, што хутка сцвярджэнне праціўнікаў беларускай мовы аб немагчымасці выкарыстання яе ў свеце, страціць усялякі сэнс. Каб атрымаць літоўскую візу, грамадзяне Беларусі маюць магчымасць запаўнення дакументаў па-беларуску. Выкарыстоўваецца беларуская мова ў зносінах з наведвальнікамі ў чэшскай і польскай дыпламатычных місіях.

Напэўна, адным з найважнейшых пазітыўных зрухаў, якія адбыліся апошнім часам — гэта разуменне прапагандыстамі беларускага слова сваёй ролі ў той справе, за якую яны ўзяліся. Рабіць стаўку на дапамогу замежных арганізацый ці на спрыянне сваіх улад не варта. Трэба дзейнічаць толькі самім — уласнымі сіламі і абапіраючыся на ўласныя сродкі. З гэтага можна зрабіць выснову, што чуткі аб смерці беларускай мовы ў Беларусі пакуль з'яўляюцца перабольшанымі. Кажучы ваеннымі тэрмінамі — ідзе перагрупоўка сіл.

Уладзімір Лапцэвіч

Краявід з візамі

[1 ☞ працяг]

да іх спінаю. Аднак, не да ўсіх. Саюз палякаў у Беларусі можа старацца аб візы для сваіх членаў па-за чаргой. І дастае іх бясплатна.

Астатнія чакаюць. Хто цярпліва, а хто і сварыцца за месца ў чарзе. Ніхто не скардзіцца на цану візаў. Значыць, патэнцыяльныя кліенты падляшскіх базараў і крамаў ёсць. Адно мусяць пераадолець пробку ля консульства. Потым адчыняецца шырокі шлях у Польшчу, які неўзабаве — калі скончыцца мадэрнізацыя кантрольна-прапускнога пункта ў Кузніцы — будзе яшчэ шырэйшы.

* * *

Жыхарам Беласточчыны атрымаць беларускія візы прасцей. Але і зацікаўленне імі меншае.

— У першых днях кастрычніка было вялікае, — кажа консул Аляксандр Харытонаў з Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, — тады жадаючыя атрымаць візу вымушаны былі трохі пастаяць у чарзе, бо нашы працаўнікі не спраўляліся з выдачай. Цяпер усё ўнармавалася. Мы выдаем каля ста візаў у дзень.

У консульстве ў Беластоку ўжо каля поўдня практычна няма чаргі. Можна ўзяць бланк, запоўніць яго ды ісці ў непадалёкі банк аплаціць аперацыю. Па пашпарт з візай можна вяртацца праз тры дні. Тыя, якім нецярпіцца, могуць атрымаць візу ўжо на другі дзень. Але тады каштуе яна ўдвая даражэй.

Пра дармовыя візы для беларускай нацыянальнай меншасці пакуль нічога не чуваць.

Мікола Ваўранюк

Аб беларусах таго і іншага палёту

„Няма свабоды без меншасцей. Нашы беларусы", — пад такім лозунгам Сакрат Яновіч прамовіў у дакладзе на ўрачыстым адкрыцці чарговага акадэмічнага года ў беластоцкай Вышэйшай школе публічнай адміністрацыі (WSAP).

Гэтая непублічная вучэльня прыняла ў гэтым годзе больш за паўтары тысячы студэнтаў. Па-за спецыяльнасцямі, вынікаючымі з назвы вучэльні, адукуе яна на такіх факультэтах, як міжнародныя адносіны, еўрапейская інтэграцыя, культуразнаўства, ці, ад гэтага года, філасофія з грамадскім ухілам. Гэтая апошняя спецыяльнасць, як сказала ў час адкрыцця новага года рэктар вучэльні прафесар Барбара Кудрыцкая, мае дапамагчы ў зразуменні таго што добрае, а што благое ў грамадскім жыцці.

Выкладчыкі WSAP (і госці) прадстаўляюць розныя светапогляды і палітычныя аптацыі. Сярод выкладчыкаў, якія ідэнтыфікуюцца з беларускім асяроддзем — прафесар Антон Мірановіч. На ўрачыстасці не здзівіла і прысутнасць лідэра Уніі рэальнай палітыкі Януша Корвіна-Мікэ, выкладчыцы школы, былой ваяводы, якая выводзіцца з АВС Крыстыны Лукашук ці прадстаўнікоў цяпер кіруючага СЛД.

У сваім выступленні падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі (СЛД) заўважыў:

— Сёння ніхто не адважыцца ў адносінах да чыноўніка прымяніць грэблівае акрэсленне *gryzipiórek — канцылярская мыш, пісака*, а аб функцыянаванні ўстаноў не гаворыцца як аб месцах, дзе галоўным чынам заварваюць гарбату і балбочуць аб абы-чым.

Сакрат Яновіч быў запрошаны прачытаць даклад не толькі як вядомы беларускі пісьменнік і публіцыст з Крынак, а нагодай было нядаўнае ўшанаванне яго Аляксандрам Кваснеўскім прэзідэнцкай узнагародай імя Анджэя Дравіча. Прыгадаў ён ледзь не ўсе найважнейшыя тэмы звязаныя з беларускімі пытаннямі і беларусамі, аб якіх таксама ў апошнія гады ўспамінаў на старонках друку. Свой даклад пачаў, успомніўшы:

— Беларуская меншасць — інтэгральная частка Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў. Нашы продкі станавілі з'яднаную дзяржаву з імперскім абсягам, рыхтуючы сабе такі самы лёс.

Зараз потым дадаў:

— Беларуская нацыянальная меншасць у сённяшняй Рэчы Паспалітай з'яўляецца, што праўда, дробнай часткай у параўнанні з агулам насельніцтва, ды непараўнальна больш значыць у маральным аспекце ўсяго народа. Яна — свайго роду лакмусавая паперка кандыцыі агульнанацыянальнага духу. Можна было б банальна сказаць: нашы беларусы сведчаць аб нас.

Яновіч тлумачыў, што кранае тут адвечную праблему адносін вялікага да малога, слабога да моцнага, існасць рыцарства.

— Далёка ў гэтый матэрыі да дасканаласці.

Заўважыў, што ў шмат якіх заходніх краінах заўважаецца „згортванне" малых народаў, падобна як беларускага ў Польшчы. Прытым, аднак, заўважаецца дбайнасць аб захаванні этнічнай разнароднасці, якая даходзіць да двух'яруснай ідэнтыфікацыі (француз-эльзасец і г.п.). Затое лакальныя мовы — раўнапраўныя з агульнадзяржаўнымі.

— З нейкай трывогай, але чакаю аналітычнага стаўлення з боку польскіх улад пасля ўваходу нашай краіны ў Еўрасаюз, — заклікаў.

Спасылаючыся на занік беларускасці на Беларусі і параўноўваючы яго да паланізацыі беларусаў, сцвердзіў:

— На Беларусі назіраецца, што ўсеагульная эмансіпацыя этнічна беларускай стыхіі адбываецца ва ўмовах па-гіганцку каланіяльных, значыць, без вычувальнага існавання нацыянальна свядомых эліт. А на Падляшшы — пад ціскам адносна вялікай бяды, якой спадарожнічае агульная заработная эміграцыя.

Праз хвіліну зазначыў:

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Сакрат Яновіч у час інаўгурацыйнага даклада. Другая справа — рэктар WSAP праф. Барбара Кудрыцкая; на другім плане — праф. Антон Мірановіч

— Меншасць не мусіць быць прыгаворана на знікненне. Валодаючы беларускай меншасцю польская дзяржава сама сабой далучыць яе да Еўрасаюза. Гэта будуць беларусы іншага палёту (...). Польскіх беларусаў чакае асобны лёс. Набліжаны да польскага, але зусім непараўнальны з гэтым на Беларусі, маргіналізаванай у Еўропе.

Яновіч прадбачвае, што Беларусь будзе „апускацца на дно ў самаізаляцыі" яшчэ два пакаленні, пакуль біялагічна не вымрэ савецкая стыхія.

— Настальгічная памяць, якая ў значнай ступені дамінуе ў большасці грамадства ў беларускай дзяржаве, катэгарычна блакіруе ўсе рэфарматарскія дзеянні, што знакаміта змяшчаецца ў фразе: які народ, такі ўрад.

Пісьменнік з Крынак звярнуў увагу на факт уфармавання ў Польшчы унікальнай з'явы — польскай беларускай літаратуры, якая высока ацэньваецца ва ўсім свеце:

— Сёння ў Польшчы дзве літаратуры: польская і беларуская.

Памалу пачынае гэта датычыць таксама іншых розных відаў сучаснага мастацтва, хоць бы жывапісу (напрыклад, Лявон Тарасэвіч) ці музыкі. Гэта ўсё, на яго думку, доказ таго, што ў Польшчы нельга гаварыць аб беларускай дыяспары (расцярушанай меншаснай групе), а якраз аб нацыянальнай меншасці, якая раней ці пазней выбухне ўласным і адрозным культурным жыццём.

Будучым чыноўнікам прыпамінаў, што ў сувязі з уваходам у ЕС наконт меншасцей у Польшчы чаканы будуць змены. Вынікі гэтага факту прымусяць м.інш. неабходнасць накіроўвання маладых людзей у вайсковую прызыўную службу выключна на месцы жыхарства, двухмоўе публічнай інфармацыі на тэрыторыі пражывання меншасцей, экзаменаванне чыноўнікаў у глыбінцы з ведання мовы, якою паслугоўваюцца меншасці.

На канец даклада прыгадаў здаўна распаўсюджваны сабой тэзіс:

— Нацыянальныя меншасці — блаславенства ў працэсе дэмакратызавання грамадстваў. Калі б іх не было, трэба было б іх выдумаць.

Тут прывёў параўнанне:

— Мізэрнае мышленне некаторых не дазваляе адрозніць благі і добры нацыяналізм: каровы і растаптанай ёю жабы.

Будучыня беларускай меншасці, у ацэнцы лаўрэата ўзнагароды імя А. Дравіча — аптымістычная. Пасля ўваходу Польшчы ў ЕС не будзе яна, прынамсі, у становішчы тае жабы.

Мацей Халадоўскі

Як дапамагчы прадпрымальнікам?

Інфармацыя аб мясцовым прадпрымальніцтве стала асноўнай тэмай X сесіі Рады горада Гайнаўкі. Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паінфармаваў аб дзеяннях гарадскіх улад у напрамку развіцця мясцовага прадпрымальніцтва. Працаўнікі магістрата прымалі ўдзел у выстаўках і кірмашах, прэзентуючы там інвестыцыйныя і гандлёвыя прапановы. Па ініцыятыве гарадскіх улад узнікла Гайнаўская гаспадарчая палата, якая гуртуе прадпрымальнікаў. Улады горада вялі намаганні з мэтай стварэння ў Гайнаўцы казначэйскай палаты (будзе адкрыта ў бліжэйшым часе). Сродкі з гарадской касы выдаткоўваліся на стварэнне ў Гайнаўцы тэхнічнага патэнцыялу для дарожных, водных і каналізацыйных інвестыцый.

У час пасяджэння завязалася доўгая дыскусія наконт стварання ўмоў для прыцягнення ў горад вонкавага капіталу. Радныя адзначылі, што не ўсе дзялкі, якія вядуць у горадзе гаспадарчую дзейнасць, зарэгістраваныя, ад чаго траціць гарадская каса. Радны БНВК Яўген Сачко запрапанаваў перагаласаваць пастанову, якая патрабавала б ад бурмістра падрыхтавання праекта ўвядзення льготаў для прадпрымальнікаў. Радная Ядвіга Рудзінская-Патэюк заўважыла, што на сесію не былі запрошаны прадпрымальнікі, якія павінны мець права выказацца ў сваіх справах. Аднак старшыня Рады Якуб Астапчук патлумачыў, што запрошаны былі прадстаўнікі згуртавання прадпрымальнікаў.

— Плануецца, што з 28% на 45% пабольшае адсотак падатку, які з казначэйскай палаты будзе непасрэдна вяртацца ў горад, — заявіў бурмістр Анатоль Ахрыцюк.

Паінфармаваў ён, што прадпрымальнікі патрабуюць стварэння Фонду гарантаваных крэдытаў. Гарадскія ўлады ахвотны выдаткаваць сродкі на такую інвестыцыю, але іншыя гміны Гайнаўскага павета не падтрымалі гэтую прапанову. Некаторыя гайнаўскія прадпрымальнікі гуртуюцца ў Інкубатары прадпрымальніцтва Падляшскага агенцтва рэгіянальнага развіцця, аддзяленне якога знаходзіцца ў Гайнаўцы. Бурмістр разлічвае, што ў будучыні будзе ён памагаць гайнаўскім прадпрыемствам у гаспадарчай дзейнасці і служыць парадай. Радныя прапанавалі выдаткоўваць грошы на дарожныя, водныя і каналізацыйныя інвестыцыі, якія створаць добрыя ўмовы для адкрывання прадпрыемстваў. Пётр Маркевіч з БНВК прапанаваў размаўляць з прадпрымальнікамі і прымаць рашэнні, маючы на ўвазе іх прапановы. Сабраныя звярталі ўвагу, што ўвядзенне льготаў у падатках, гэта новыя месцы працы і дадатковы даход ад новапрынятых на работу людзей. Прапанавалі наладзіць бізкае супрацоўніцтва з арганізацыямі, якія гуртуюць прадпрымальнікаў. Радны ад СЛД Ян Вайцюк пайшоў далей і запрапанаваў, каб бурмістр прадставіў у бліжэйшым часе план развіцця прадпрымальніцтва ў горадзе. Гэтая ідэя ў выглядзе пастановы была прынята раднымі.

У час сесіі радныя разглядалі праект грамадска-гаспадарчай палітыкі горада Гайнаўкі на 2004 год. У галасаванні вырашылі, што самымі важнымі справамі ў наступным годзе будуць: намаганне ў напрамку гаспадарчага ажыўлення горада і скарачэння беспрацоўя, мадэрнізацыя цеплавой сеткі, падрыхтаванне дакументаў на будову крытага басейна і заканчэнне мадэрнізацыі амфітэатра. Радныя займаліся яшчэ грамадскімі справамі горада і адобрылі выкананне бюджэту за першае паўгоддзе 2003 года.

Аляксей Мароз

Непрадумана або мэтанапраўлена

Фота М. МІНЦЭВІЧА

Надгарэлая жывая таполя пры дарозе з Бельска ў Орлю

Штогод ранняй вясной і восенню на няўгоддзях, лугах, аблагах і пакінутых камбайнамі высокіх пожнях расцвітаюць безнаглядныя агні. Віляючы над краявідам дым падкупляе здалёк асаблівай прывабнасцю, але заўсёды адбываецца гэта коштам прыроды. Ад агню гіне не толькі шмат дробнай жывёлы, але сярод траў акунаюцца ў полымя кусты і маладыя дрэўцы ды, нярэдка, выгараюць цэлыя прыдарожныя алеі дрэў.

Манія падпальвання сухіх траў, нягледзячы на законную забарону, ахапіла ўсіх без аглядкі на ўзрост. Найчасцей такое здаровае, але абпаленае дрэва перастае расці, што часта з'яўляецца і мэтай некаторых гаспадароў, каб прызначыць іх да скарэйшай высечкі.

Міхал Мінцэвіч

З камітэта ў таварыства

Дрэнная атмасфера стварылася яшчэ перад агульным сходам Грамадскага камітэта будовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Яго ўправа не прыняла ў члены камітэта новых асоб, якія запоўнілі заявы і ўплацілі гадавыя ўзносы. Сярод іх былі радныя Гайнаўскага павета і Анастасія Майсеня — жонка Канстанціна Майсені, пачынальніка будовы музея.

Агульны сход не мог распачацца ў дзесяць гадзін, як запланавалі арганізатары, бо сабралася менш паловы членаў камітэта. З'езд пачаўся ў другім тэрміне на гадзіну пазней (згодна са статутам), у прысутнасці звыш сарака членаў. У большасці былі гэта пенсіянеры, якія раней на грамадскіх пачатках памагалі пры будове музея. Прысутнічалі таксама старшыня БГКТ Ян Сычэўскі, стараста Гайнаўскага павета Уладзімір Пятрочук і бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк. З-за хваробы не прыбыў Канстанцін Майсеня. Старшыня рэвізійнай камісіі Віктар Бура прапанаваў спачатку зачытаць пратакол камісіі і разглядзець справу прыняцця ў камітэт новых членаў. Аднак прыняты пераважнай большасцю галасоў парадак дня не прадбачваў дыскусіі над пратаколам рэвізійнай камісіі. Кшыштаф Ангельчык са Звязу беларускай моладзі, які падаў заяўку на ўступленне ў камітэт, прыйшоў даведацца, чаму не прынялі яго ў арганізацыю, але не атрымаў дастатковага тлумачэння. Вядучы сход Уладзімір Іванюк сказаў толькі, што ўправа камітэта рашыла справу перадаць новай управе. Тлумачыў ён, што згодна са статутам такімі справамі сход не павінен займацца. Мікола Клімюк паясніў, што парадак працы сходу не прадбачвае падвядзення вынікаў працы ўправы камітэта, бо гэта нечарговы сход, скліканы для змены назвы арганізацыі і статута.

Старшыня ўправы Ян Хіліманюк паінфармаваў аб дзейнасці музея ў апошнім часе. Выкананы былі поручні для лесвіцаў, ладзіліся выстаўкі і іншыя мерапрыемствы. Апошнім часам музей існаваў, у галоўным, за кошт арэндных плат (звыш 7 600 зл. у месяц). Гэтыя сродкі выдаткоўваліся на зарплаты і ўтрыманне музея. Каля 4 тыс. зл. у месяц музей атрымліваў з гарадскога бюджэту за арэнду кіназалы, 700 зл. у месяц за арэнду залы для Гарадской галерэі „Гайна" і па 300 зл. аднаразова за арэнду залы на вясельныя мерапрыемствы. На завяршэнне будовы музейнага комплексу трэба выдаткаваць яшчэ 315 тыс. зл. Прадбачваецца таксама рэканструкцыя на музейным участку вясковай хаты і ветрака.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ва ўправу Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" ўвайшлі бурмістр Анатоль Ахрыцюк, старшыня БГКТ Ян Сычэўскі і стараста Уладзімір Пятрочук і, мабыць, іх голас будзе рашаючым

Арганізатары сходу прапанавалі змяніць назву арганізацыі з Грамадскага камітэта будовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы на Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" і абмеркаваць праект змяненняў у статуце арганізацыі. Завязалася доўгая дыскусія наконт назвы і статута. Прапанаваліся названні: Музей беларускай культуры, Цэнтр беларускай культуры, а нават Музей Гайнаўскай або Падляшскай зямлі. Міхал Голуб зачытаў новападрыхтаваны праект статута, але сабраныя не рашыліся разглядаць яго. Тлумачылі, што за кароткі час нельга пазнаёміцца з абшырным дакументам. Прынята была прапанова ўвядзення запісу аб ганаровых членах таварыства. Старшыня БГКТ Ян Сычэўскі запрапанаваў, каб запісаць у статуце, што таварыства павінна дзейнічаць у цесным супрацоўніцтве з павятовымі аддзеламі і галоўным праўленнем БГКТ. Васіль Сакоўскі прапанаваў дадаць, што таварыства павінна дзейнічаць у блізкім супрацоўніцтве з усімі беларускімі арганізацыямі. Аднак сабраныя не рашыліся ўводзіць гэтыя папраўкі і вязаць сабе рукі абяцаннямі. Міхал Байко прапанаваў, каб у статуце адзначыць, што ў музеі будзе прэзентавацца праваслаўная культура. Аднак яго прапанова не атрымала падтрымкі. Ян Хіліманюк паінфармаваў, што і без дадатковых запісаў адна зала, у якой зараз знаходзіцца выстаўка пра Афонскую гару, будзе выкарыстоўвацца на прэзентацыю праваслаўнай культуры. Пасля дыскусіі сабраныя адобрылі прапанаваную ўправай назву Таварыства „Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы" і ў яўным галасаванні прынялі статут.

Старшыня рэвізійнай камісіі Віктар Бура ўсё ж такі прачытаў пратакол з працы камісіі. Рэвізійная камісія прапанавала адаслаць Яна Хіліманюка ў пратэрмінаваны водпуск (15 дзён за 2001 год і 26 дзён за 2002 год). Старшыня паінфармаваў, што бухгалтар не падвёў фінансавых падлікаў за 2002 год. Ад апошняга кантролю рэвізійнай камісіі працаўнікі музея зрабілі парадак у складах экспанатаў, але многія палатняныя экспанаты надалей нішчэюць у мяшках. Рэвізійная камісія пахваліла музейных работнікаў за дасканаленне кваліфікацый і развіванне дзейнасці бібліятэкі і выступіла да ўправы з прапановай адклікаць з пасады старшыню Яна Хіліманюка і галоўнага бухгалтара Ілью Агіевіча за няправільнасці ў працы. Вядучы сход паінфармаваў, што вынікамі працы рэвізійнай камісіі будзе займацца новавыбраная ўправа.

Сабраныя выбралі новую ўправу з 15 асоб і рэвізійную камісію з 5 асоб (у новыя ўлады не трапілі ні Ян Хіліманюк, ні Віктар Бура). На агульным сходзе паявілася прапанова, каб уся ўправа, разам са старшынёю, працавала на грамадскіх пачатках. За сродкі, якія дагэтуль плаціліся для старшыні ўправы, прапанавалася аплачваць будучага дырэктара. Удзельнікі сходу прынялі праграму дзейнасці таварыства на бліжэйшыя гады. Прадбачваецца ў ёй, што ўправа выступіць да Ваяводскага сейміка ў Беластоку і Павятовай рады ў Гайнаўцы з просьбай, каб тыя схацелі весці на прынцыпе цывільна-юрыдычных дамоў, дзейнасць Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Сабраныя запрапанавалі наладзіць некалькі нарад з удзелам прадстаўнікоў беларускіх арганізацый, каб зацікавіць іх дзейнасцю музея. Улады таварыства выступяць да замежных беларускіх арганізацый, якія фінансава падтрымалі будову музея, каб даслалі свае матэрыялы дзеля прэзентацыі іх у гайнаўскім музеі.

Аляксей Мароз

Вачыма паляка

І хочацца, і колецца

Вось, першы раз у апошнія гады, а, несумненна, першы раз у гэтым стагоддзі польскі прэм'ер прызямліўся на беларускай зямлі. Ну, бо як напісаць, што наведаў Беларусь. Неафіцыйны візіт Лешка Мілера абмежаваўся да ўдзелу ва ўрачыстасцях 60-годдзя першага бою дывізіі імя Касцюшкі пад Леніна. Калі б тая мясцовасць знаходзілася па-за тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь, прэм'ер Лешак Мілер і так туды б паехаў.

Аднак, для беларускай прапаганды прыезд польскага прэм'ера аказаўся немалой неспадзяванай удачай, дзеля доказу, што факт ізалявання Беларусі пад уладаннем Аляксандра Лукашэнкі гэта фікцыя. Не досыць, што прыбыў асабіста шэф урада дзяржавы-члена НАТА, а праз няцэлае паўгода і Еўрасаюза, да таго ў кампаніі іншых прадстаўнікоў свайго ўрада, прытым і міністра абароны Ежы Шмайдзінскага. На нішто здаліся тлумачэнні, што справа была ў аддачы пашаны жаўнерам дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі і іх саратнікам. Прысутнасць пры Лешку Мілеру беларускага прэм'ера Сяргея Сідорскага была канчатковым доказам, як прарочылі перад урачыстасцямі „Белорусские новости", пералому ў двухбаковых адносінах, а Беларусь гэта партнёр, з якім лічацца ў Еўропе і свеце. Вядома, ніякі пералом не наступіў, і не дзеля пераломвання адносін падаўся пад Леніна польскі прэм'ер.

Шмат інфармацыйнага шуму затое паявілася на тэму ягонай сустрэчы з прадстаўнікамі апазіцыі. Андрэй Адляніцкі з „Пагоні" паведамляў, што незалежна ад ускладненняў зробленых спецслужбамі, удалося старшыні беларускіх сацыял-дэмакратаў Міколу Статкевічу перакінуцца словам з шэфам суседняй, заходняй дзяржавы. Высновы з гэтага факта Мікола Статкевіч зрабіў хіба за далёкія. Вось гэтак пракаментаваў у „Пагоні": „Візіт Мілера ў Беларусі гэта не толькі праява павагі да польскіх герояў, якія загінулі змагаючыся за вызваленне Польшчы і Беларусі ад фашызму, але і маральная падтрымка беларускай апазіцыі". Справа ў тым, што прэм'ер Мілер, нягледзячы на кіслую міну прэм'ера Сідорскага, выйшаў з будынка мясцовага музея на вуліцу да групы апазіцыянераў — калі верыць паведамленню Андрэя Адляніцкага з „Пагоні" — сацыял-дэмакратаў. Аднак, як паведамляла варшаўская „Rzeczpospolita", спасылаючыся на Уладзіміра Шанцава, лідэра магілёўскай апазіцыйнай Аб'яднанай грамадзянскай партыі, „пасля выхаду з музея Лешак Мілер у чарговы раз спрабаваў прывітацца з намі. Апранутыя ў цывільнае мужчыны схапілі нас і адсунулі ўбок".

Не ведаю, на канец, да каго выйшаў Лешак Мілер і ці фактычна размаўляў ён з апазіцыяй, незалежна ад таго, ці з сацыял-дэмакратамі, ці з Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Калі б прэм'ер Лешак Мілер нават неафіцыйна хацеў сустрэцца з апазіцыянерамі і паразмаўляць з імі, гарантавалі б яму гэта польскія дыпламатычныя службы, от, хоць бы пры дапамозе прадстаўніцтва АБСЕ. Не трэба было б выконваць ухілы і дзіўныя жэсты з гэтым выхадам на вуліцу з музея і іх інтэрпрэтацыяй, блізкай звышінтэрпрэтацыі. Летась удалося гэта прабываючаму таксама неафіцыйна ў Беларусі прэм'еру Чэхіі. Што больш, адмахнуўся ён публічна таксама ад усіх кантактаў на афіцыйным узроўні. Не зрабіў гэтага прэм'ер Мілер. Не здзіўляе затым жаль, які мае да шэфа польскага ўрада былы кіраўнік Беларусі Станіслаў Шушкевіч. Польская каманда з прэм'ерам Мілерам на Беларусі паводзіла сябе, як славутая нявінніца, якая і хацела б, і баіцца.

Так ці іначай, не было ніякага пералому ані ў адносінах з афіцыйнымі ўладамі, ані з беларускай апазіцыяй. Прэм'ер Мілер быў пад Леніна, а не ў Беларусі, хоць, несумненна, гэтая мясцовасць распаложана на тэрыторыі гэтае краіны. І толькі ўспамін застаецца аб апошніх размовах на найвышэйшым узроўні абедзвюх дзяржаў — сустрэчы ў Белавежскай пушчы прэзідэнтаў Лукашэнкі і Кваснеўскага ў 1997 годзе. Польска-беларускія адносіны стаяць усё ў мёртвым пункце, таксама і з беларускай апазіцыяй.

Дарэчы. Я атарапеў, калі дзень да 60 гадавіны бою пад Леніна журналіст тэлестанцыі „Polsat" паведамляў аб візіце Лешка Мілера, карыстаючыся той самай тэрміналогіяй, якая паявілася ў г.зв. рэжымных медыях, аб быццам бы магчымасці пералому. Як відаць, прапаганда Лукашэнкі паспяхова даходзіць і ў Варшаву, прынамсі ў нейкай частцы. А хапіла б патэлефанаваць у польскае знешнепалітычнае ведамства.

Мацей Халадоўскі

Слава і багацце літаратурнай нівы Беласточчыны

(заканчэнне; пачатак у 41 н-ры)

Пасляваенная Польшча па сутнасці ўпершыню ў гісторыі краіны і народа адкрыла шырокую дарогу ў свет — да самай высокай навукі, да любых пасад — перад усімі, у тым ліку і перад прадстаўнікамі сацыяльных нізоў, колішніх найбольш бяспраўных слаёў грамадства. З асяроддзя сялянства выраслі не толькі настаўнікі, чыноўнікі розных рангаў, але і вучоныя, пісьменнікі, дзеячы культуры. Такім вось чынам і сам Аляксандр Баршчэўскі, выхадзец з асяроддзя, якое інтуітыўна заўсёды моцна цягнулася да кнігі, да друкаванага слова, да ведаў, але ніколі не мела рэальнага права здабываць гэта на шырокім свеце, атрымаў поўную і роўную з усімі магчымасць канчаць навучальныя ўстановы ўсіх ступеняў і дасягнуць вучонага звання прафесара, і пакінуць такі шырокі след у паэзіі і ў літаратуразнаўстве.

Тымі пераўтварэннямі законна можна было б цешыцца і ганарыцца ўсім — і тым, хто так неспадзявана даў рады выкарыстаць новыя магчымасці для росту, для ажыццяўлення мар, для ліквідацыі ўсіх бар'ер, што спрадвеку перагароджвалі дарогі ў шырокі свет. І ўсім тым, каму ніколі не быў абыякавым лёс грамадства, краіны і яе жыхароў. Гэтым здзяйсненням аднак спадарожнічалі і трагічныя з'явы, якія нявыказным болем адгукаліся ў сэрцах сапраўдных патрыётаў зямлі Беластоцкай — і самога Аляксандра Баршчэўскага, і па сутнасці ўсіх пісьменнікаў-белавежцаў. Многія выхадцы з вёскі, перабраўшыся ў горад і дасягнуўшы больш ці менш значнага дабрабыту, на працягу нейкага часу парывалі духоўную сувязь з роднымі вытокамі, традыцыямі, адракаліся ад мовы бацькоў і дзядоў, сталі пагардліва адносіцца да зямлі, якая стагоддзямі лічылася маці-карміліцай, да ўсяго ладу жыцця на вёсцы, хоць там яшчэ заставаліся іх бацькі і найбліжэйшыя сваякі.

Імкнучыся парваць усякую сувязь з роднай вёскай, персанажы апавядання Віктара Рудчыка „Жменя зямлі" прымушаюць бацьку Андрэя прадаць сваю зямлю, наносячы яму гэтым страшэнную маральную рану. Не ратуе яго і тое, што ён схаваў пад кашуляй дзве торбачкі з такой роднай зямлёю. І калі ўжо канчаткова страціў сваю гаспадарку, не мог сам зрушыцца з месца: „Усё забралі... усё... — шаптаў Андрэй, а дзве вялікія слязы сцякалі па глыбокіх баразнах яго старэчага твару".

У манаграфіі Аляксандра Баршчэўскага „Творцы беларускага літаратурнага руху ў Польшчы. 1958-1998" асаблівую цікавасць выклікае раздзел пра Сакрата Яновіча. Ён дае нагляднае ўяўленне не толькі пра самога пісьменніка, але і пра тыя працэсы, пераўтварэнні і змены, што адбыліся ў жыцці беларускай вёскі на Беласточчыне на працягу апошніх дзесяцігоддзяў; Вось мы чытаем: „У пасляваенны перыяд у выніку небывалых грамадскіх перспектываў велізарныя групы вясковых беларусаў хлынулі ў гарады... Гэтак ці інакш узнікла глыбокая прорва паміж пакаленнямі. Вясковыя бацькі сілаю рэчаў заставаліся захавальнікамі старых архаічных нормаў і прывычак, а іх гарадскія дзеці станавіліся носьбітамі новай местачковай маралі, якая дыктавала абыякавыя, непрыхільныя і нават варожыя адносіны да ўсіх атрыбутаў сялянскай беларускай рэчаіснасці, а перш за ўсё да мовы сваіх бацькоў і дзядоў" (с. 394). І далей мы бачым канкрэтны разгляд творчасці пісьменніка: „Сакрат Яновіч (...) уважліва прыглядаўся да гэтага працэсу... Практычна амаль усе апавяданні аўтара ілюструюць разнародныя формы сутыкнення старой беларускай псіхікі з новай псіхікай тых маладых беларусаў, якія папалі ў мястэчкі і гарады" (с. 394). Такую праўду жыцця нясуць чытачам зборнікі празаічных твораў пісьменніка „Загоны", „Доўгая смерць Крынак". Апошні зборнік наводзіць аўтара манаграфіі на трывожныя і балючыя высновы: „Доўгая смерць Крынак" — гэта свайго роду элегія ці эпітафія на пліце, якую рыхтуе пісьменік да магілы не толькі сваёй мясцовасці, але, як гэта ні балюча, быць можа і для цэлай беларускай меншасці ў Польшчы..." (с. 396). Падобная выснова паўтараецца яшчэ раз: „У суме, проза Сакрата Яновіча, як малая, так і вялікая, — гэта карціна пасляваеннай беларускай вёскі і пасляваеннага польскага горада, які сваім магнітам павыцягваў з вёсак Усходняй Беласточчыны беларускія сэрцы і бязлітасна кінуў іх на гарадскія брукі ды асфальты. Па сутнасці, мы маем тут дачыненне з беларускай катастрофай, з беларускім самагубствам, ці канчатковым — не ведаем. Будзем верыць, што беларускае літаратурнае слова, у тым ліку і Яновічава, праявіць магічную сілу, якая ўльє моц і веру ў беларускія душы".

Вельмі высокая ацэнка творчым здзяйсненням пісьменніка даецца ў заключэнні манаграфічнага раздзела: „Празаічная, публіцыстычная і драматургічная творчасць Сакрата Яновіча сведчыць аб тым, што ён знаходзіцца ў творчым росквіце, і чытачы могуць чакаць ад яго ўсё новых твораў, якія будуць формай ілюстрацыі розных абшараў беларускага жыцця ў Польшчы. Аднак ужо зараз Сакрат Яновіч з'яўляецца адным з найбольш плённых і ўсебаковых белавежцаў. Як пісьменнік ён яшчэ не вычарпаў усіх магчымасцяў свайго творчага патэнцыялу" (с. 407).

Паэтычныя і празаічныя здабыткі белавежцаў уяўляюць арганічную частку працяглага літаратурнага развіцця беларуска-польска-рускага, а не ўсяго толькі Усходняй Беласточчыны, як гэта магло б камусьці ўявіцца пры знаёмстве са зместам паасобных твораў, часцяком дастаткова цесна прывязаных да нейкай канкрэтнай мясцовасці — ці то Белавежы, ці Крынак, ці рэчкі Нарвы, ці вёскі Бандары (з якой паходзяць сам Аляксандр Баршчэўскі — Алесь Барскі, Васіль Баршчэўскі ды і аўтар гэтых радкоў) або Мора (радзімы Віктара Шведа).

Наогул у манаграфіі Аляксандра Баршчэўскага разгляд творчасці канкрэтных аўтараў добра спалучаецца з агульнатэарэтычнымі разважаннямі, якія даюць магчымасць чытачу шырэй зірнуць на літаратурны працэс і на месца ў ім таго або іншага пісьменіка.

Уладзімір Казбярук

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Злева: віцэ-ваявода Ежы Паўяновіч, куратар Зофія Транцыгер-Кочук, віцэ-міністр Францішак Патульскі і ваявода Марэк Стшалінскі.

Асвета на павароце

— Грошы на асвету ў ваяводстве недастатковыя — гэта адна з высноў Ваяводскай камісіі грамадскага дыялогу, якая сустрэлася 8 кастрычніка г.г. у Беластоку. Сярод істотных праблем асветы, апрача фінансаў, выхаваўчыя праблемы, беспрацоўе сярод настаўнікаў і дэмаграфічны спад.

— Я, са свайго боку, звяртаюся да жыхароў вашага ваяводства, каб пастараліся выправіць дэмаграфічны крызіс, — заклікаў Францішак Патульскі — віцэміністр нацыянальнай адукацыі і спорту. У першыя класы прыйшло менш дзяцей, і як паказваюць статыстыкі гэта толькі пачатак з'явы. Прадстаўнік міністэрства звярнуў увагу, што ў Падляшскім ваяводстве недастаткова праводзяцца асветныя інвестыцыі. У сувязі з гэтым ёсць прапанова, каб 20% ваяводскага кантракту было адведзена толькі на інвестыці. Аднёсся таксама да здарэння ў Торуні (дзе вучні здзекаваліся над настаўнікам англійскай мовы):

— Школе патрэбна дысцыпліна, — гаварыў, — я сам калі працаваў дырэктарам школы, два разы пацягнуў за вуха жулікаватага вучня. Жаль, што мінулі гады, калі самым вялікім пакаранням лічылася паслаць школьніка па бацькоў. А зараз патрэбна дапамога кожнага. Бо школа гэта не энклаў, яна такая як грамадства.

Беспрацоўныя паланісты і гісторыкі

На 1 001 беспрацоўнага настаўніка зарэгістраваных у Ваяводскай управе працы было толькі 166 прапаноў. Найбольшае беспрацоўе ў паўночна-заходніх гмінах (Монькі 11%), найменшае ў Сямятыцкім павеце — 7%. Сярэдняя краіны — 14 працэнтаў. Сярод беспрацоўных найбольш паланістаў і гісторыкаў. З другога боку існуе праблема недахопу настаўнікаў англійскай мовы. Англійская мова, як замежны абавязковы прадмет, выкладаецца ўжо ў 73% школ. Аднак якасць працы настаўнікаў гэтай мовы не заўсёды задавальняючая. Не хапае англістаў з поўнымі кваліфікацыямі.

— Добра калі гэта студэнты англійскай мовы, бо тут ёсць перспектыва, — гаварыў дакладчык, — аднак часта выкладаюць гэты прадмет настаўнікі без спецыялістычнай падрыхтоўкі.

Другое месца пасля англійскай мовы ў ваяводстве, займае руская (15%), трэцяе — нямецкая (9%). Лацінскую мову зараз вывучае толькі 2% навучэнцаў сярэдніх школ.

Вінаватае безграшоўе

Прыярытэтамі на 2003/2004 навучальны год падляшскі куратар лічыць юрыдычную адукацыю дзяцей і моладзі і ў сувязі з гэтым у школах праводзяць сустрэчы з паліцыяй і пракурорамі, а таксама педагагічная адукацыя бацькоў. Вядуцца юрыдычна-адукацыйныя праекты як: „Драму і трагедыю — пакінь тэатру", „Свядомыя сваіх правоў і абавязкаў". Кураторыя наладзіла інтэрвенцыйны тэлефон, пры якім кожны дзень, дзве гадзіны дзяжурыць візітатар.

— Звоняць да нас вучні і бацькі, — кажа куратар Зофія Транцыгер-Кочук — а настаўнікі чамусьці менш.

Шмат увагі адведзена было інвестыцыям, якія з-за недастатку грошай не дачакаліся яшчэ рэалізацыі. Аж у 23 гмінах не хапае гімбусаў, ёсць школы, у якіх няма камп'ютэрнага абсталявання і гміны, у якіх няма ніводнай гімнастычнай залы.

Наколькі праблема безграшоўя адвечная, удзельнікі канферэнцыі сцвердзілі, што ўрад РП і парламент павінны прызначыць асвеце такую суму, каб хапіла яна на неабходныя патрэбы. На сённяшні дзень, бюджэты падляшскіх самаўрадаў і так выдаюць больш чым павінны на асвету, — часта коштам іншых задач.

Ганна Кандрацюк

Любім Дзень настаўніка

Святкаванне Дня нацыянальнай адукацыі ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы распачалося 13 кастрычніка з віншаванняў настаўнікаў на ўроках. У час дзвюх лінеек вучні найстарэйшых класаў ліцэя і гімназіі выступілі перад настаўнікамі і моладдзю з прадстаўленнямі. На першую лінейку прыйшлі белліцэісты з настаўнікамі. Перад імі з беларускімі песнямі выступіў калектыў „Знічка". Пасля ліцэісты з IV „ц" класа паказалі што можа стацца ў школе, калі настаўнік па-партнёрску паставіцца да вучняў. Белгімназісты прадставілі сцэнкі з урокаў. Артыстычную частку закончылі выступленні музычнага гімназічнага калектыву, які спяваў беларускія песні. Белгімназісты паказаліся больш беларускамоўнымі ад ліцэістаў і паказалі сцэнкі з урока беларускай мовы.

— Любім Дзень настаўніка, бо ў гэты дзень нашы педагогі весялейшыя, чым звычайна і не пытаюць нас. Нашы настаўнікі „файныя" і можна пажартаваць з імі. Аднак калі трэба вучыцца, дык вучымся, — заяўляе Амелія Горбач.

— Нашы настаўнікі стараюцца зацікавіць нас урокамі і як найбольш навучыць. Раз у год у іх свой дзень і мы павінны падзякаваць ім за працу, — кажа Аня Сянкевіч.

Працаўнікоў школы павіншавалі асветны інспектар з Гайнаўскага староства Уладзімір Петручук, дырэктар белліцэя Яўген Сачко і яго намеснік Аляксандр Лаўрыновіч. Першы ўручыў узнагароду старасты Гайнаўскага павета дырэктару Яўгену Сачко. Астатні павіншаваў настаўнікаў белліцэя Аляксандра Лаўрыновіча, Яна Місеюка, Ядвігу Дамброўскую, Альжбету Міклашэвіч, Ірэну Клімовіч і Агнешку Пэрдыён з узнагародамі дырэктара школы.

Аляксей Мароз

Зорка

старонка для дзяцей

Васіль Вітка

Лістапад

Як малое птушанятка,
Перабег лісток дарожку.
Кінуўся за жоўтым статкам,
Мільганулі толькі ножкі.

Закружылі па асфальце
За чародкаю чародка.
Любыя, не адлятайце —
Будзе вырай ваш кароткі.

Зменіцца зіма вясною,
Узляціце зноў на дрэвы.
Зноў шчасліваю парою
Я пачую вашы спевы.

Восень

Вярнулася залатая восень
з кошыкамі віна.
Залаты ліст мне на плячо ўпаў.
Залатая восень — пазалочана.
Залаты ліст — дождж і лес.

Аня Артэмюк, VI кл. ПШ у Аўгустове



Найлепшы падарунак

Так завецца новы кампакт-дыск бельскай „Журавінкі". На ім семнаццаць песень. Музыка і словы напісаны ў большасці вядомымі беларускімі аўтарамі і кампазітарамі.

Здаецца, няма патрэбы пісаць вам пра гэты самы папулярны дзіцячы гурт Беласточчыны. Згадаем толькі, што „Журавінка" дзейнічае з 1992 года. Зараз спяваюць у ёй сем шасцікласніц бельскай „тройкі": Юліяна Дораш, Ірміна Максімюк, Караліна Ігнацюк, Альжбета Шмыдкі, Ганна Паўлючук, Кацярына Лукашук і Ева Шырэнос. Выдавец запісу — Рада бацькоў ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім.

Многія з вас памятаюць першы запіс гэтага гурту. З часам амаль усе песні сталіся агульнавядомымі школьнымі гітамі, як „Шэры кот", „Журавінка", „Дзве курачкі"...

У сучаснай „Журавінкі" вельмі сучасны рэперутар. Вельмі характэрныя выкананні салістак — Юліяны Дораш і Евы Шырэнос. Хопіць пачуць іх адзін раз, і мелодыя сама запамінаецца. Мы ўпэўнены, што і новыя песні з часам стануцца агульнавядомымі дзіцячымі шэдэўрамі. Дарэчы, такая мэта запісу — песні „Журавінкі" маюць узбагачаць рэпертуар навучэнцаў беларускай мовы. Мастацкі кіраўнік гурту — Сяргей Лукашук — дзякуючы падтрымцы Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь, зноў прыносіць нам найлепшы падарунак.

Зорка

Гануля

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Гануля Пякарская з Беластока заўсёды падбірае жартаўлівыя вершы. Яны падыходзяць да бадзёрага і жывога характару дзяўчынкі. Гэтым разам Гануля дэкламавала верш Алеся Бадака „Колькі кот набіў пасуды". Вершы пра катоў і мышак заўсёды на першым месцы ў дзіцячым рэпертуары.

— А чаму?

— Бо коцік часта абаронцам дзяцей, — кажуць сябры-аднагодкі Ганулі. — Бо часта, калі мы самі паб'ем пасуду, кажам бацькам, што вінаваты коцік!

Гануля Пякарская — лаўрэатка трэцяга месца ў Нараўцы.

Зорка

Восень у маіх вачах

Надышла восень. Наступілі кароткія дні і доўгія ночы. На двары пахаладнела. Так яно ўжо ёсць у прыродзе.

Восень — гэта такая пара года, калі дні пахмурныя і дажджлівыя. Мне весялей, калі сонечна і спакойна, але і дажджу ніколі замнога. Час ад часу ўздымецца вецер і нагоніць чорныя, сінія і шэрыя хмары, з якіх дождж паліецца як з вядра. Калі хмары ўжо разыдуцца, а мы глянем угару — убачым асенняе неба — блакітнае і воблачнае.

Дрэвы жоўкнуць і губляюць рознакаляровае лісце, якое сцелецца жоўтым, чырвоным, аранжавым і карычневым дываном. Лісце, якога восеньскі вецер не сарваў яшчэ з дрэў, залоціцца на аголеных галінках.

Жывёла, як і людзі, робіць запасы на зіму. Перад доўгім сном прыводзіць у парадак сваё жытло. Птушкі, як буслы, чаплі, качкі і іншыя, адлятаюць у цёплыя краіны.

Восень — пара года, якую любяць і назіраюць мае вочы.

Ева Мароз, II „б" кл. Гімназіі ў Гайнаўцы

Вершы Віктара Шведа

Якая розніца?

— Скажы мне, мама дарагая, —
Запыталася Вікторыя, —
Будзе розніца якая
Паміж практыкай і тэорыяй?

— Тэорыя: як адвячоркам
Па папяросы пойдзе тата,
А практыка — калі на золку
Тата вяртаецца дахаты.

Дбайны зяць

На цягнік збіраецца бабуля,
Трэба ж білет купіць у касе.
— Не турбуйся, — кажа ўнучка Уля, —
Часу многа маем у запасе.

Татка наш хвалюецца няспынна,
У ад'езд твой сёння цвёрда верыць.
Перавёў ён стрэлкі на гадзіну
Нашага гадзінніка наперад.

Дуб

У адным лесе стаяў дуб. Ён быў вельмі магутны. Гэты дуб быў як церамок. На першым паверсе жылі мышы. На другім — Дзяцел, а на трэцім знайшла сабе прытулак Вавёрка з ваверчанятамі. Мышкі збіралі зярняткі, розныя скарынкі, што заставаліся ў лесе ад нядбайных людзей. Дзяцел лячыў дрэвы — быў доктарам. Вавёрачка скакала з дрэва на дрэва. Яе хвост служыў ёй парашутам.

Аднойчы Вавёрка прывяла сваё ваверчаня да Дзятла і кажа:

— Доктар, мой сынок захварэў, у яго тэмпература. Што параіш даць яму?

— Я даў бы яму чаю з малінай.

Вавёрка падзякавала і пайшла. Яна ўсё так і зрабіла, як параіў доктар Дзяцел, і з той пары ваверчаня ніколі не хварэла.

Вось так і жылі яны ў лесе: дружна, весела. Але аднойчы на верхавіну дуба прыляцела Варона. Ёй вельмі спадабаўся дуб: высокі, густы, ціхі. Яна вырашыла пасяліцца на ім. Назбірала галінак і пачала рабіць сабе гняздо. Склала галінкі кучкаю і села зверху. Сядзіць і каркае-пляткарыць: той не туды пайшоў, той не туды паляцеў, не тое прынёс, не там стукае. Жыццё ў насельнікаў дуба стала невыносным і цяжкім. Яны пачалі спрачацца, сварыцца між сабой.

Сабраліся аднойчы ўсе разам, сталі раіцца, як далей жыць.

— Трэба яе выгнаць з нашага церамка, — стукнуў дзюбай Дзяцел.

— Трэба заняцца выхаваннем Вароны, — прапанавалі вавёркі.

— Трэба аддаць Лісіцы, няхай з'есць яе, — прапішчалі мышы.

А Варона сядзела непадалёк і ўсё чула. Спалохалася чорная пляткарка.

— Не выганяйце мяне. Я выпраўлюся. Мне вельмі падабаецца маё жытло, — папрасілася яна, а потым дадала: — Мне без вас будзе сумна. Давайце зноў жыць др-р-ружна.

І стала Варона камендантам дуба. Сумленна выконвала свае абавязкі. Усе разам зажылі яны дружна, адной сям'ёй, быццам ніколі і не сварыліся.

Максім Дзяргач,
Мінская вобласць, г. Любань, СШ № 3

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Эвеліна

Эвеліна Бяроза — вучаніца пятага класа Пачатковай школы ў Орлі. Ужо чарговы раз дзяўчынка ўдзельнічала ў конкурсе „Роднае слова". Эвеліна падрыхтавала верш Станіслава Шушкевіча — „Не рашаецца задача". Верш прагучаў на сцэне некалькі разоў, яго чамусьці ўпадабалі дзяўчаты. Выступленне Эвеліны вылучалася мілагучнасцю і сімпатычным выкананнем. Сама дэкламатарка таксама вельмі вясёлая дзяўчынка.

За сваё выступленне Эвеліна атрымала вылучэнне ў Нараўцы і гэтым самым пашырыла круг лаўрэатаў з Орлі, якая ў апошнім конкурсе паказалася з найлепшага боку.

Зорка

Жолуд

Жолуд нарадзіўся вясной. Бацька Дуб падарыў яму зялёны берэцік.

Побач на галінках жылі браты, такія ж прыгожыя мацачкі. Днём Жолуд грэўся на сонцы, а ноччу хаваўся пад шырокі ліст, як пад дах.

Бацька Дуб ніколі не сумаваў. Часта наведвалася Сарока, расказвала апошнія навіны. Аднойчы прыляцеў Дзяцел. Ён спадабаўся Жолуду, бо таксама меў на галаве берэт, толькі чырвоны. Дзяцел — доктар, а Дуб жыў якраз на яго ўчастку. Ён уважліва агледзеў дрэва, пастукаў па ім. І запэўніў, адлятаючы: „Дуб здаровы... як дуб".

Адшукаў дарогу да Дуба і няпрошаны госць — Дзік. Галодны, ён сярдзіта тыцкаўся лычом у ствол. Жолуд спалохаўся: здалося, восьвось упадзе пад ногі Дзіку. Ён ажно заплюшчыў вочы, але ўтрымаўся на галіне, як і яго браты.

А потым прыйшла ў лес восень. Вецер ірваў з Дуба лісце, моцна трос галіны. І Жолуд упаў на зямлю.

Пройдзе час, і на гэтым месцы праб'ецца да сонца кволы расток. Вырасце новы Дуб. І будзе ў яго сынок — Жолуд з прыгожым берэцікам на галаве.

Паўлік Шахновіч, Мінская вобласць, Слуцкі раён, Сяражская СШ

Уладзімір Мацвеенка

Перакруткі

Сеня
Сена
Косіць,
Сева
Сена
Носіць.

Носіць
Сена
Сева,
Косіць
Сена
Сеня.

Твар

Калі глядзім у даль
І адышлі мы з дому,
Бачым чыйся твар,
Можа мамін, а, можа, братаў.

Калі пройдзем хоць малы крок,
Ужо не бачым нічыйго твару.
Слёзы нам капаюць з вачэй,
Бо так хочам бачыць каханы твар.

Наталля Вярбіцкая, Гімназія ў Нараўцы

Фота ЯНКІ ЦЕПУШЭЦКАГА

На фэсце ў Новай Волі выступіў гурт „Лучына" з Беластока

Наведалі фан-клуб Адама Малыша

(успамін летніх канікулаў)

Я, як кожны вучань, з нецярплівасцю чакала канікул. Думка пра два месяцы свабоды напаўняла мяне аптымізмам. Сёлетнія канікулы пачаліся цёплымі, сонечнымі днямі. Надвор'е спрыяла адпачынку. Першы месяц я пабывала на вёсцы ў бабулі і дзядулі. Летняй парою ў вёсцы вельмі многа працы. Гэта час уборкі ўраджаю — сенакос, жніво. Я адчувала сябе патрэбнай, калі памагала пры ўборцы ўраджаю. Мы з сястрой з прыемнасцю хадзілі ў лес на экскурсію. І любілі загараць на сонцы.

18 жніўня мы цэлай сям'ёй выбраліся на Святую Гару Грабарку, каб адсвяткаваць Спаса. Пасля вячэрніх малітваў мы начавалі ў палатках, спалі на надзіманых матрацах. Гэтае святое месца і яго атмасфера падбадзёрылі нас духова.

Канец жніўня аказаўся для мяне найбольш прыемным. Споўніліся мае мары. Мы паехалі ў горы да сваякоў у Бельска-Белую. Першага дня, разам з сястрой і бацькамі, я глядзела горад і помнікі старадаўнасці. Наступнага дня мы пабывалі ў Шчырку і Вісле. Найбольш захапляліся горным краявідам і ручаямі. Вялікае ўражанне зрабіў на нас стары лыжны трамплін у Вісле. Мы ўвайшлі на самы верх трампліна, з якога калісьці скакалі слаўныя польскія лыжнікі. На канец дня мы наведалі бар „У бусла", пры якім існуе фан-клуб Адама Малыша. Трэцяга дня чакала нас экскурсія на Гару Шындзельню па канатнай калейцы. Мы з сястрой пайшлі на вяршыню Бэскідаў — Клімчок. Вясёлай забавай паказаўся праезд саначнай дарогай. Яшчэ мы наведалі горад Жывец, яго краязнаўчы парк і замак. Сумныя адчуванні суправаджалі нас у час наведання канцлагера ў Асвенціме.

Большасць часу мы праводзілі на паветры, шпацыравалі, кармілі рыб у рэчцы Сола. Купілі памяткі, зрабілі здымкі і поўныя ўражанняў вярнуліся дахаты.

Ва ўсім свой пачатак і канец. Скончыліся і канікулы, за якімі буду сумаваць ды доўга ўспамінаць. З надыходам новага навучальнага года, поўная сіл і ахвоты да навукі, я пайшла ў новую школу.

Марта Неліпінская, I „ц" кл. Агульнаадукацыйнага ліцэя з беларускай мовай навучання імя Браніслава Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім

Польска-беларуская крыжаванка № 43

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 39: Швед, выснова, песня, код, буч, рада, гарбата, ар, парк, нара. Яр, пуга, вечар, рыс, сноб, Аня, шворан, вада, дар, мара.

Узнагароды — каляровыя аўтаручкі — выйгралі: **Тамаш Максімюк** і **Наталля Кандрацюк-Свярубская** з Беластока, **Пятрусь Герасімюк** з Арэшкава, **Анджэліна Сельвясюк** з Бельска-Падляшскага.

Заблоччына — самая легендарная вёска Польшчы

Заблоччына — вёска на ўскраіне Лядскай пушчы. З аднаго боку вёскі знаходзіцца лес, а з другога — рэчка Нараўка. Першыя звесткі пра мясцовасць з'явіліся ў 1778 годзе, але пра Заблоччыну, як пра вёску, гаворыцца ўжо ў 1796 годзе. Вядома таксама, што ў 1793 годзе кароль Станіслаў Аўгуст аддаў яе на ўласнасць каталіцкаму касцёлу ў Нараўцы. Але ўжо ў 1844 годзе вёска разам з фальваркам перайшла на казначэйства Рускай імперыі. Да вайны ў Заблоччыне жыло 200 чалавек.

31 ліпеня 1941 г. гітлераўцы перасялілі жыхароў вёскі ў Козлікі ля Заблудава. Усё дабро немцы зрабавалі, а хаты спалілі. Пасля вайны вёска адбудавалася і ў 1979 годзе жыло там 220 асоб, зараз — 70.

Назву вёска ўзяла ад Іосіфа Заблоцкага, які жыў недалёка Нараўкі. Яго сям'я была вельмі беднай і часта не было ў іх чаго есці. Заблоцкі смуткаваў аб сваёй цяжкай долі. Ён доўга думаў, як здабыць грошы. Урэшце заняўся вырабам мыла. Прадукцыя ішла нядрэнна і неўзабаве тавар трэба было прадаць. Тады Заблоцкі збудаваў плыт і выправіўся ў першае падарожжа. Было яно аднак няўдалым, плыт разбіўся, а ўвесь тавар паплыў рэчкай. Заблоцкі цудам ацалеў, але пасля некалькіх гадоў памёр. Людзі, якія тут пасяліліся, назвалі вёску ад прозвішча свайго дзіўнага і легендарнага продка. Усе пакаленні ведаюць прымаўку старую як свет: „Выйшаў, як Заблоцкі на мыле", але ці ідзе ў ёй пра ўсім вядомага Заблоцкага ці пра нейкага іншага — гэтага ніхто не ведае.

Магдзе Каліноўскай з VI „б" класа расказала мама Зіна Каліноўская

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Багдан Дудко (злева), Міраслава Лукша і Міраслаў Грыка

Любоў да мясцовага

Міраслава Лукша і Міраслаў Грыка 26 верасня сустрэліся ў Гарадской публічнай бібліятэцы ў Гайнаўцы з жыхарамі горада, у тым ліку з героямі сваіх кніжак. Арганізатарамі мерапрыемства былі мясцовая бібліятэка і Мастацка-літаратурны часопіс „Карткі", які выдаў зборнікі „Вершы тутэйшыя" Міраславы Лукшы і „Расказы з-над Нарвы" Міраслава Грыкі. Раней кніжкі прэзентаваліся ў Цісоўцы, Беластоку і Ломжы.

Міраслава Лукша пералічыла некаторыя прозвішчы герояў свайго паэтычнага зборніка „Вершы тутэйшыя", у тым ліку прысутных у чытальным зале Міхася Андрасюка, Міколы Бушко і Зосі Лемеш. Аўтарка ўспомніла Сакрата Яновіча, Аляксандра і Яна Максімюкоў, Лявона Тарасэвіча і іншых герояў, вядомых гайнаўскім чытачам.

Галоўны рэдактар „Картак" Багдан Дудко адзначыў, што абедзве кніжкі прасякнуты любоўю да мясцовага і тутэйшага. Гайнавяне дашукаліся ў прэзентаваных творах многіх элементаў звязаных з Гайнаўшчынай і пыталіся, ці аўтары не баяцца крытыкі з боку герояў кніжак.

— Пісала я пра асобы, якіх люблю і шаную. Я думала як пісаць аб іншых, каб не дакараць іх. Аднак у агульным мае вершы не аб героях, але аба мне. У кніжцы паказана маё асабістае бачанне гэтых людзей. Усё, што я напісала, прафільтравала праз сябе і нешта ўва мне засталося. Закранала я таксама інтымныя справы, але старалася не перабраць меру, — заявіла Міраслава Лукша. — Я часта пісала, калі дрэнна сябе адчувала і гэтая праца была для мяне тэрапіяй.

— Сапраўдны пісьменнік лопне, калі нічога не напіша. Я пішу вельмі хутка, але тады атрымоўваецца пісанне без душы. Добрыя творы пішуцца паволі. Мае апавяданні гэта лісты да самога сябе. Нават я не разумею сябе да канца. Спяшаюся кахаць людзей, — сказаў Міраслаў Грыка і раздаў жанчынам па кветачцы з букета, што стаяў на стале.

Міраслава Лукша чытала свае вершы, а героі яе зборніка дзякавалі за напісаныя творы.

— Кніжка Міраслава Грыкі так мяне захапіла, што некалькі дзён запар чытаў яе з пяці да васьмі гадзін раніцы. Яна памяняла маё бачанне Нарвы. Калі праязджаю праз яе, гляджу на лавачкі ў парку як на нешта з душой, — хваліў Міхась Андрасюк „Расказы з-над Нарвы". Гайнавяне цёпла ўспрынялі таксама вершы Міраславы Лукшы. Аднак папракнулі, што „Карткі" як выдавец замала клапоцяцца, каб кніжкамі зацікавіліся культурныя асяроддзі Польшчы.

У час спаткання можна было купіць кніжкі з аўтографам аўтараў.

Аляксей Мароз

Другое жыццё забароненага спектакля

12 кастрычніка ў Малой зале Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра пры поўным аншлагу прайшоў паказ забароненай увесну мясцовымі „чыноўнікамі ад культуры" пастаноўкі рэжысёра Генадзя Мушперта „Самотны захад".

Прэм'ера беспадстаўна забароненага спектакля, пастаўленага паводле п'есы вядомага ірландскага драматурга Марціна Мак-Донага, адбылася яшчэ ў красавіку гэтага года і выклікала нездаровы ажыятаж. Пасля „грамадскага прагляду" з удзелам чыноўнікаў Упраўлення культуры і намесніцы старшыні Гродзенскага аблвыканкама Марыі Біруковай адбылося абмеркаванне, падчас якога актораў і рэжысёра абвінавацілі ў адсутнасці густу, ужыванні ненарматыўнай лексікі, пошласці і знявазе каталіцкіх вернікаў. Вердыкт „чыноўнікаў ад культуры" быў суровы і заключаўся ў лаканічнай фразе Марыі Біруковай: „Когда уберёте всю эту грязь, тогда и можно будет показывать спектакль зрителю".

Аднак рэжысёр Генадзь Мушперт не мог пагадзіцца з такім рашэннем, бо інакш спектакль страціў бы ўсю сваю вострасацыяльную напругу і надзённасць ды ператварыўся б у нудотную цягамоціну. У пастаноўцы якраз галоўную ролю грае тэкст, і яна пабудаваная на канфрантацыі фраз. Выразы „бляха-муха", „гніда хрэнава", „жопа", „гаўнюк" ці „насраць" гучаць са сцэны не абразліва, а натуральна ўпісваюцца ў сямейна-побытавыя сюжэтныя калізіі. Ну якая сварка не абыходзіцца без лаянкі? І не спрачаюцца ж сёння два п'яныя браты на мове арыстакратаў 18 стагоддзя!

— Рыхтуючыся да адкрыцця новага тэатральнага сезона, мы амаль нічога не мянялі ў гэтым спектаклі, — прызнаў заслужаны артыст Беларусі Сяргей Курыленка. — Наадварот, дзея дынамізавалася, калі замест актора Кірыла Андронава ролю ксяндза выконвае сам рэжысёр-пастаноўшчык Генадзь Мушперт. Тут, безумоўна, дапамог ягоны жыццёвы і творчы досвед...

Сама пастаноўка — люстра жыцця на правінцыі, з усімі ягонымі побытавымі праблемамі ды сацыяльнымі балячкамі. Два сквапныя браты Колеман (актор Аляксандр Шэлкаплясяў) і Вален (Сяргей Курыленка) пасля трагічнай смерці бацькі аніяк не падзеляць спадчыну і ўвесь час сварацца. Фрывольная дзяўчына Гірлен (акторка Аксана Плікус) гандлюе самагонам і заляцаецца да ксяндза Вельша (Генадзь Мушперт). Ну а ксёндз спрабуе прымірыць двух братоў, развязаць праблемы веры. Ягоная маральная пастава і сумленне знаходзяцца ў канфрантацыі з рэчаіснасцю, і ён сканчае жыццё самагубствам — топіцца ў возеры...

— Я не думаю, што гэта п'еса абражае пачуцці каталіцкіх вернікаў, — лічыць рэжысёр Генадзь Мушперт. — У шмат якіх творах літаратурнай класікі святары паказаны ў камічным плане. Веравызнанне тут ні пры чым, калі ў чалавека з пачуццём гумару ўсё ў парадку...

А ці няма праблем з пачуццём гумару ў „чыноўнікаў ад культуры" з Гродзенскага аблвыканкама і ці не забароняць яны спектакль „Самотны захад" другі раз — пакажа час.

Людвік Сарока

Падарылі 1 000 кніжак

Гмінная публічная бібліятэка (ГПБ) у Нараўцы (Гайнаўскі павет) налічвае 12 тысяч тамоў і каля 400 чытачоў. ГПБ купляе кніжкі кожны год. Прыбывае іх і іншым шляхам. Менавіта, шмат асоб падарыла ёй уласныя кнігазборы.

У мінулым годзе частку сваіх кніжак перадалі ў бібліятэку Аліцыя і Андрэй Карчэўскія з Масева ды Галіна Клім, Вера Фібік, Агнешка Марз'ян-Стоцкая, Анеля Бяляўская, Альжбета Внук, Ліля Рубчэўская і Яўгенія Сухадола — усе з Нараўкі. Пасля падобны дар ГПБ атрымала ад Евы і Яцка Касмоўскіх з Варшавы, Дануты Кучынскай з Янова каля Нараўкі ды Цаліны і Баляслава Марчукоў з Нараўкі.

Сёлета свае кніжкі падарылі ГПБ Крыстына Мэер з Плянты і Барыс Руско з Белавежы (усе свае зборнікі вершаў). Звыш 50 кніжак у Нараўчанскую публічную бібліятэку перадала Гарадская публічная бібліятэка ў Гайнаўцы. І так, дораных папулярных кніжак сабралі сама менш тысячу. Гмінная публічная бібліятэка ў Нараўцы выказвае шчырую падзяку ахвяравальнікам кніжак.

(яц)

З народнымі абрадамі

Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў перыядзе май — верасень у супрацоўніцтве з самаўрадамі арганізавала народныя фэсты ў паасобных мясцовасцях Беласточчыны. Карысталіся яны вялікай папулярнасцю і заўсёды былі мнагалюднымі. А цяпер у сваім памяшканні па вуліцы Варшаўскай, 11 БГКТ арганізуе для жыхароў Беластока выступленні мастацкіх калектываў. Распачаліся яны канцэртам народнага ансамбля „Грымата" са Слоніма.

Фота АНТАНІНЫ БАЎБЕЙ

„Тыневічанкі" ў абрадзе „Адведкі"

28 верасня мастацкія самадзейныя калектывы выступілі з народнымі абрадамі. „Каліна" з Залук паказала сцэнку „Зяць-дыктатар", з Валянцінай Паплаўскай — кіраўніком гурту ў галоўнай ролі. З гэтай жа вёскі дзіцячы калектыў „Калінка" паказаў сцэнку з былога жыцця вёскі „Багаты бацька". Калектыў „Асенні ліст" з Гарадка выступіў з народным абрадам „Адведкі". З такой жа сцэнкай выступілі таксама „Тыневічанкі" з Тыневіч-Вялікіх. Народныя абрады ўжо зніклі або занікаюць. Хвала тым гуртам, якія паказваюць артыстычнае багацце нашых бацькоў і дзядоў.

А калектыў „Крыўчанкі" з вёскі Крывец прадставіў дажынкавую абраднасць — сцэнку „Пэрапеліца". Жніўныя песні выконвалі пажылыя жанчыны з моцнымі галасамі.

11 кастрычніка прыехалі ў БГКТ тры самадзейныя калектывы з беларускімі народнымі абрадамі. „Расспяваны Гарадок" прадставіў абрад, які спадарожнічаў капанню бульбы. „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага паказалі першы дзень вяселля, а „Цаглінкі" — другі дзень вяселля, так званае „Прыданае". Кожны калектыў выканаў па чатыры песні са свайго рэпертуару.

Выступленні самадзейнікаў, апрача беластачан, глядзела замежная моладзь (па 12 чалавек з Галандыі, Фінляндыі і Англіі). Прыехалі яны па запрашэнні І Агульнаадукацыйнага ліцэя з Беластока ў рамках праграмы „Млодзеж", рэалізаванай пры дапамозе Еўрапейскага Саюза ды многіх арганізацый і ўстаноў Беласточчыны, у тым ліку і БГКТ. Арганізатарамі праекта былі, між іншым, Галена Дабжынска, Альжбета Ольдынска, Адам Гэнвзьвіл і іншыя.

Міхась Хмялеўскі

Шляхта на агародзе

Шарачковая шляхта са Століншчыны, як магніт, прыцягвала ўвагу ўсякіх падарожнікаў. Найбольш у даваенны час, калі праз балоты Палесся рушыла чыгунка. Аўтары, як Генрых Узембла ў „Балоце... казачным", з маршу лавілі шляхотнасць і патрыятызм хадачковай браціі:

— У натоўпе кірмашу ці ў царкве, ужо на першы погляд, адрозніваюцца ад іншых, хаця і ў такіх жа лапцях, такой жа світцы — шляхта ад мужыкоў. Найбяднейшы галыш, хадачковы або сярмяжны шляхціч, у выглядзе, у антрапалагічных рысах, у бліску вока, а нават у спосабе закручвання вусоў, хоць у мужыцкай світцы, хоць у дзіравых парцяных портках як рэшта натоўпу, а ўсё відаць, што ў сямейнай скарбніцы-куфры захоўвае „бумагі" — шляхоцкія граматы, найчасцей з часоў Баторыя або каралевы Боны.

— А шляхта тут не абы-якая, — пісаў у адзін тон Міхал Марчак у даваенным даведніку — яна хоць з накінутай ёй праваслаўнай верай, а свядома свайго польскага і класавага паходжання і нават на могілках відочная гэтая розніца, дзе шляхта пакоіцца ў сваім, асобным ад мужыкоў, баку.

* * *

І сёння нашчадкі столінскай шляхты адрозніваюцца ад звычайных калгаснікаў і пралетараў. Наўрад, ці ў смак гэтае адрозненне вышэйзгаданым падарожнікам. Бо Століншчына ў Рэспубліцы Беларусь вылучаецца тым, чым Арляншчына ў Польшчы, карацей — адсюль родам трэць усяго праваслаўнага духавенства.

Гэты феномен адлюстраваны нават у краявідзе, яшчэ далёка да Рубеля, з-за балот і старога пакручастага разгалінавання ракі Гарынь, вырастаюць як з-пад зямлі блакітныя купалы цэркваў. На месцы раскажуць яшчэ пра цуд, пра крыж-камень, які „вырастае" з зямлі.

У Рубель, непадалёк мяжы з Украінай, едзем добрай асфальтавай дарогай ад Століна. Першае адгалінаванне ракі перасякаем паромам, другое і трэцяе — па аграмадным мосце, збудаваным тры гады таму.

У пачатку мясцовасці дзве царквы — драўляная Свята-Міхайлаўская з 1796 года і мураваная, пабудаваная на працягу апошніх гадоў за кошт вернікаў.

— Пэўна, адна шляхце, а другая — мужыкам, — думаеш пад уплывам прачытанага ў даваенных даведніках.

Мясцовыя ўспрымаюць гэта як анекдот і зводзяць на зямлю:

— Бо ў старой царкве ўжо не памясціліся.

* * *

Як сведчаць крыніцы, у Рубелі, вядомым раней як Любэр, пражываюць нашчадкі рыцара Разана. Мясцовасць дараваў яму сам кароль Ягайла. У 1511 г. князь Ян Яраслаў Бароўскі перадаў яе роду Зымойгевічаў. Да часоў айчыннай вайны Рубель лічыўся самым вялікім засценкам Століншчыны. Сёння пражывае тут за тры тысячы жыхароў.

— А як ваша прозвішча? — пытаю у сімпатычнай жанчыны, якая разам з дачкой прывезла з поля воз моркваў.

— Мамановіч.

У мясціне захаваліся таксама гістарычныя прозвішчы: Разановічы, Пашкевічы, Маслякевічы, Жалігоўскія.

Пра антрапалагічныя рысы нашчадкаў шляхты пісаць мне складана. Мяшае іх свойскі выгляд, характар. Усе, як добрыя сваякі, здаюцца мне тут прыгожымі і ветлівымі, рады з маршу завесці гутарку з прыезджым.

— Нэвжэ вы з Пульшчы? — здзіўляюцца маці з дачкой.

— З Білосточчыны, — і мроіцца мне, што стаяю сярод вуліцы ў Орлі або Дубічах-Царкоўных. Бо ў гэтым засценку размаўляюць гаворкай такой, як у нас, у Орлі. Чамусьці тут нахабна праследвае і арлянская прыказка: *Наша Вуорля, наш Іван — хто нэ з Вуорлі, то нэ пан!*

* * *

Восем кіламетраў далей, у Альпені, здаецца што я ўжо ў Чыжах (тут мяккае вымаўленне). Маім прывідам спрыяе кашмарная стома, якая налятае ад інтэнсіўнасці ўражанняў.

Нашчадкі шляхты і тут не супадаюць з даваеннымі ўзорамі. Замест хлеба і солі, нас, як „палякаў", сустракае нечаканая аплявуха:

— У нас лучче было жыть, как у вас! — грыміць, як у часы халоднай вайны, альпеньскі старажыл.

— А помніце, как за тэлевізарамі да нас прыязджалі? — цягне дзед і патрасае кійком.

Адчакаўшы сваё, перабіваем ветэрану манадрам.

— А мы да вашай жонкі, — кажам, — каб пра уніяцкую царкву расказала. Пра часы уніі, якую тут завялі ў даваенны час, цётка ўспамінае з настальгіяй.

— Людзі падзяліліся на два бакі. Уніяты не дазвалялі жаніцца з праваслаўнымі, а праваслаўныя з уніятамі. Бо адны і другія лічылі сябе лепшымі. Пасля вайны ўсё зацерлася, зараз у Альпені адны праваслаўныя.

Альпень, як і Рубель, мае старажытную метрыку. У 1479 годзе княгіня Ганна Свідрыгайлаўна дарыць мясцовасць Зянону Альпінскаму. З 1515 г. князь Ян Яраславіч Бароўскі надае яе Зянону Ляшкевічу і Яну Тугай-Ліпскаму, што пацвярджае граматай каралева Бона. У 1551 г. Альпень належыць братам Чэрнышэвічам-Канапліцкім. Прывілеі мясцовай шляхты пацвярджае ў 1669 г. Міхал Карыбут-Віснявецкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Новая царква ў Рубелі

У пачатку мясцовасці захавалася Успенская царква з 1888 года. Уніяцкі храм, у якім пасля вайны зрабілі магазін, не існуе.

* * *

— А шляхта тут не абы-якая — паўторым за даваеннымі даведнікамі, — і зараз нашчадкі верныя феадальным традыцыям.

Каля царквы знаёмімся са спадарыняй Марыяй, якая пад неба расхвальвае прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку:

— Ён добры, ён за народам! — дэкларуе маладзіца. Апавядае як прэзідэнт асабіста дапамог жыхарам Альпеня, карацей, асабіста павысіў цану на малако.

Калі ў іх калгасе перасталі даваць зарплату, людзі не здаліся, не апусцілі рук. Сабраліся і паехалі ў Столін на скаргу. Тут у раёне прыняў іх чыноўнік, чалавек з вертыкалі прэзідэнта. Ён выслухаў іх пратэст і яшчэ пры ўсіх пазваніў у Мінск. Праз колькі дзён у іх калгас пазваніў сам прэзідэнт. Ён загадаў старшыні калгаса павысіць у два разы цану малака. І зараз, хаця ў калгасе не даюць зарплаты, за літр малака, якое калгас скуплівае ад гаспадароў, плацяць прыблізна як у магазіне, аж 400 рублёў — на нашы грошы выходзіць — пяцьдзесят грошаў.

У параўнанні з іншымі мясцовасцямі Палесся „шляхоцкія" аколіцы — задбаныя і багатыя. Тут, нягледзячы на феадальныя адносіны з кіраўніком дзяржавы, адкрыліся на капіталізм.

* * *

У Велемічах, чарговай шляхецкай мясціне, пабудавалі шыкоўныя катэджы. Пры вуліцы шарэнгі з крамамі і рух як на біржы. Сярод тавараў адна гародніна. Прадаюць яе таксама проста з вазоў, трактароў і грузавікоў.

— Уся ваколіца жыве з гародніны, — кажа Марыя. — Людзі пабралі ўчасткі ў калгасе і вырошчваюць моркву, буракі, цыбулю. На загонах, якія даюць нядрэнны прыбытак, працуюць цэлыя сем'і. У ролі пасрэднікаў тут *чорныя* — так па засценках завуць каўказцаў і армян — яны скупляюць тавар і пасля прадаюць у Пецярбургу. За кілаграм моркваў, на месцы, зарабяюць па 350 рублёў, амаль столькі за літр малака, пасля прэзідэнцкага павышэння. Ідзе, здаецца, да старога, калі *шляхціч на загародзе* — г.зн. „на агародзе" — будзе *роўны ваяводзе!*

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Сям'я Мамановічаў жыве з гародніны

Разважанні аб ЗУСаўскіх практыках

Аб практыках ЗУС — установы сацыяльнага страхавання можна пачуць многа спрэчнага. Адны гавораць, што ЗУС вядзе палітыку абмежавання пенсій для інвалідаў, а другія, што групу інваліднасці можна купіць за хабар.

У час парламенцкай дыскусіі над праектам устанаўлення Генеральнай пракураторыі пасол Януш Вайцяхоўскі гаварыў: „Нельга дазволіць на ўстанаўленне закону, які дапускаў бы магчымасць заставацца чыноўніку сам на сам з тым, хто афармляе справу. Не гавару пра хабарніцтва, але і нельга выключыць такі факт".

Калі я ў 1995 годзе пераводзіўся на пенсію па прычыне хваробы, дык ставіўся перад трохасабовай камісіяй па справах інваліднасці і працы. Складалі яе лекар тэрапеўт, хірург-артапед і прадстаўнік ЗУС. Пасля ўсебаковага абследавання і праверкі лячэбных дакументаў, камісія прызначыла мне бестэрмінова другую групу інваліднасці. Адначасова адзначыла, што інваліднасць узнікла ў час працы на чыгунцы. З таго часу мінула восем гадоў. Стан майго здароўя настолькі пагоршыўся, што апошнім часам не магу з месца варухнуцца. Штогод праходжу шпіталізацыю і рэабілітацыю. Безвынікова. Я паслаў заяву ў ЗУС, каб мяне абследавалі і прызначылі групу інваліднасці адпаведную майму здароўю. На камісію ставіўся ў маі г.г. Не спадзяваўся станоўчага для сябе выніку, бо ў час падачы заявы ў Гайнаўскім ЗУСе пачуў, што цяпер надта складана атрымаць першую групу. І сапраўды, у атрыманым рашэнні прачытаў: „Здольны самастойна жыць". Нічуць не здзівіўся, бо аглядаў па тэлебачанні як інваліду без нагі ў ЗУСе сказалі тое ж. Папрасіў я дырэктара Беластоцкага аддзялення ЗУС адказаць, якімі крытэрыямі карыстаецца лекар-абследавацель ды ад каго мне патрабаваць кампенсацыю за затрату здароўя на чыгунцы. Дырэктар праінфармаваў, што за кампенсацыяй можна звяртацца ў ЗУС пасля далучэння пасведчання аб прафесійнай хваробе, якое павінны выдаць у Павятовым санітарным інспектараце. Чыноўнічка ў Гайнаўцы разгледзела паказаны мною дакументы ды сказала такое: „Вам, калі вы адыходзілі на пенсію, не памецілі статыстычнага нумара хваробы. Зараз нельга яго ўстанавіць". Не стаў спрачацца. Падзякаваў пані інспектар ды пашлёпаў да выхаду. Такім як я адно прымаўка застаецца на пацяшэнне: „Цярпі душа, спасённай будзеш".

Уладзімір Сідарук

У прыгарадах Пецярбурга

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Часткова адрамантаваны Фёдараўскі сабор

Кацярынінскі палац у Царскім Сяле паказваецца турыстам здаўна. Ад некалькіх гадоў вядуцца рамонты астатніх палацаў і цэркваў, што знаходзяцца побач. Мала прыкметныя звонку будаўнічыя працы ў Аляксандраўскім палацы, збудаваным для цара Аляксандра I ў 1792-1796 гадах. У ім правялі апошнія гады свайго жыцця цар Мікалай II і яго сям'я. Вясной 1917 года царскія дзеці асабіста капалі палацавы агарод пад капусту, моркву і цыбулю. Прымусілі іх да гэтага дрэнныя харчы, якімі кармілі інтэрнаваных. Летам 1917 года царская сям'я пад моцным канвоем была вывезена. У час II сусветнай вайны палац быў аграблены і моцна знішчаны. Пасля рэканструкцыя вялася вельмі павольна. Зараз запушчаны таксама Аляксандраўскі парк.

Непадалёк знаходзіцца Фёдараўскі сабор са старымі іконамі. Сярод іх — копія Фёдараўскай іконы Божай Маці. Ікона гэтая ў 1239 годзе з'явілася для князя Васілія Кастрамскога і змешчана была ў царкве Фёдара Страцілата, непадалёк ад Кастрамы. Многа чалавек атрымала ад яе аздараўленне. Маліліся перад Фёдараўскай іконай Мікалай II і царскія сямейнікі. Цар любіў заходзіць у ніжнюю царкву Фёдараўскага сабора, якую асвяцілі ў гонар прападобнага Серафіма Сароўскага (яго праслаўленне адбылося ў 1903 г. па ініцыятыве цара). Хаця рамонт Фёдараўскага сабора распачаўся, у верхняй царкве праводзяцца богаслужэнні.

Царыца Аляксандра, жонка цара Мікалая II і яе дочкі хадзілі маліцца ў Знаменскую царкву, якая знаходзіцца побач Кацярынінскага палаца. Яе нядаўна адрамантавалі. У храме знаходзіцца копія Знаменскай іконы Божай Маці і ікона прападобнага Серафіма Сароўскага, якую прывёз з Дзівеева Мікалай II. Будучы ў Дзівееве цар заязджаў да блажэннай Пашы, якая прадказала царскай сям'і іх асабістую трагедыю і гора ў краіне.

У цэрквах у Царскім Сяле пад іконамі вісяць малітвы да Хрыста, Божай Маці і святых, выявы якіх знаходзяцца на іконах. Паломнікі карыстаюцца вывешанымі тэкстамі.

Пецярбург і прыгарады наведваюць заходнія турысты. Экскурсаводы ведаюць англійскую або нямецкую мовы, але цяжэй дагаварыцца са старэйшымі асобамі, якія днём апякуюцца цэрквамі.

Турыстаў прыцягвае Пецяргоф — летняя рэзідэнцыя цароў. Комплекс збудаваны быў у XVIII-XIX стагоддзях. Самым цікавым месцам у ім з'яўляецца Ніжні парк з унікальнымі каскадамі і моцнымі вадамётамі. Прыезджых захапляюць фантаны. Самым цікавым лічыцца „Самсон", збудаваны на знак перамогі рускіх войск над шведамі пад Палтавай у 1709 г. Каскады фантанаў спалучаны з палацамі — Вялікім, Марлі і Манплезір. У палацы Манплезір любіў прабываць цар Пётр Вялікі. Самымі цікавымі пакоямі ў Вялікім палацы з'яўляюцца тронавы зал і кітайскі кабінет. Многа ў іх золата і дарагіх матэрыялаў.

Аляксей Мароз

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН-АСТАШЭВІЧ

Лоўкія рукі Марыі Сцепанюк рвалі і фармавалі воўну

Студзіводскі асяродак валення

Музей малой айчыны ў Студзіводах, што каля Бельска, 4 кастрычніка напоўніўся ўспамінамі. Дарафей Фёнік, ініцыятар шматлікіх мерапрыемстваў, прысвечаных гісторыі Бельска і ваколіц, гэтым разам задзівіў жыхароў Бельшчыны, адкрываючы адзіны на Падляшшы, а можа нават і ў цэлай Польшчы, Студзіводскі асяродак валення. Для малодшага пакалення назва „валёнкі" амаль нічога не гаворыць.

Валёнкі — абутак з воўны (з бітага фільцу) — яшчэ пасля вайны, трыццаць-дваццаць гадоў таму карыстаўся папулярнасцю як на вёсцы, так і ў горадзе. Запатрабаванне на валены абутак, які добра трымаў цеплыню калі тэмпература на дварэ даходзіла да трыццаці і больш градусаў ніжэй нуля, знаходзіў многіх аматараў.

У міжваенны перыяд валёнкі рабілі ў гарадах жыды. У самім Бельску было пяць шапавальняў, у якіх працавала каля 60-ці чалавек, у тым ліку жыхары Студзіводаў. Былі гэта сем'і Кандрацюкоў, Сцепанюкоў, Асташэўскіх, Кірылюкоў і іншыя.

Немцы ў час акупацыі прымусілі майстроў да працы на патрэбы фронту ў прадпрыемстве „Grunstok". Пазней, у Народнай Польшчы, хаця забаранялася самастойная вытворчасць і продаж валёнак без рэгістрацыйнай карты, студзіводцы далей выконвалі абутак. Міліцыя часта неспадзявана праводзіла вобыск у хатах, шукаючы не толькі самых валёнак, але і воўны, і хаця саматужнікі часта штрафаваліся, нелегальнае валенне працягвалася. Так было ў сям'і Марыі Сцепанюк, якая стала нават перад судом у Беластоку.

— Аднак людзі памагалі адзін аднаму, — успамінаў Фёдар Асташэўскі. — Аднойчы, разам з міліцыяй на рэвізію накіравалі да нас у вёску жанчыну з фінансавага аддзела. Была зіма і тыя міліцыянты (нашы сваякі са Студзіводаў) так павялі яе, што папалі на рэчку, і калі лёд праламаўся і яна прамокла, то з гэтага часу нікога ўжо не прысылалі.

Праца пры валенні, хаця цяжкая, прыцягвала маладых людзей, бо можна было падзарабіць, паколькі даходы з гаспадарак былі невялікія. Як сказала Марыя Сцепанюк, можна было за гэтыя грошы і дзяцей вывучыць. Як хтось патрапіў рабіць добрыя валёнкі, то і праца была, і грошы. Толькі сезон быў кароткі, бо трываў два месяцы, ад лістапада да снежня. Яна патрапіла зрабіць 40-50 пар валёнак у дзень і тады, разам з мужам, ездзіла ў Сакалоў-Падляшскі, Грубешаў прадаваць іх. Пры валёнках скалясіла „кавалак" Польшчы!

У шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады многа людзей ездзіла на кантракты ў Вэнграў, Замасць, Тарнаў, Холм, Грубешаў. Пазней не было ўжо праблемы купіць звычайны фабрычны абутак.

Выстаўка ў Музеі малой айчыны мела не толькі тэарэтычны, але і практычны характар. Можна было прасачыць працэс вырабу валёнак: фармаванне воўны, валенне яе насуха і намокра, сушэнне, фарбаванне. Лоўкія рукі Марыі Сцепанюк рвалі і фармавалі воўну, а моцныя рукі майстра Фёдара Асташэўскага лямчылі яе пры дапамозе гарачай вады, каб атрымаўся абутак. Праца патрабавала не толькі сілы, але і дакладнасці, бо дрэнна зробленыя валёнкі маглі не пратрымаць зімы.

Госці выстаўкі маглі самі спрабаваць папрацаваць пры вырабе валёнак. Пасля такой спробы бельскі віцэ-староста Пётр Бажко сказаў: „Валёнкі, якія да гэтай пары асацыяваліся мне з дзяцінствам, запахам вёскі, перасталі быць абстракцыяй, а сам праект вастаўкі лічу ідэальным". Шчыра запрашаю ўсіх наведаць музей у Студзіводах.

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Семяноўскае вадасховішча — месца для вудзільшчыкаў

Вельмі добрым месцам для рыбаловаў з'яўляецца Семяноўскае вадасховішча. Тых, якія ў ім вудзілі, не трэба да гэтага пераконваць. Няма тут большых цяжкасцей, каб злавіць шчупака ці акуня.

Карыстальнікам вадасховішча з'яўляецца Акруговае праўленне Польскага саюза вудзільшчыкаў у Беластоку. Яно сюды дастаўляе малявак. Асабліва выгадныя ўмовы ў вадасховішчы для карпа. Прычына — высокая ўрадлівасць у першых гадах пасля пабудовы вадасховішча і адсутнасць харчовых канкурэнтаў па прычыне разрэджвання чарады рыб у рацэ Нарве.

Вельмі спрыяльныя ўмовы для размнажэння і ўзрастання маюць лінь і лешч. Каля вёскі Рудня можна злавіць таксама ментуза. Гэтае месца таксама вельмі атракцыйнае для лоўлі рыб пад лёдам. Вада пры паўночным беразе Семяноўскага вадасховішча вельмі хутка награваецца і рыба ў гэтым раёне пачынае інтэнсіўна карміцца ўжо ранняй вясной. Можна лавіць большасць выступаючых тут відаў. Рэкамендаваны метад — з плаўком. Пазямельны без паплаўка адраджаем, паколькі на дне знаходзіцца мноства падводных раслін.

Вельмі атракцыйнае месца да рыбалоўлі на вуду з берага, на якім раней знаходзілася вёска Лука. У гэтым месцы знаходзіцца старарэчышча Нарвы і якраз тут ёсць вялікі шанц злавіць вялікую рыбіну. Тут шмат дрысёну, у якім выгаднае патайное месца для розных відаў рыбы.

(яц)

Вострава а не Востраў

Адгалоскі

У „Ніве" часта змяшчаюцца карэспандэнцыі Аляксандра Вярбіцкага. Паўтараецца ў іх назва мясцовасці *Паўночны Востраў* у Крынскай гміне. Аднак „Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny" (Ossolineum, 1980 г.) падае назву, якою карыстаюцца самі астраўляне: *Paun'ocznaja* і *Pałudni'owaja W'ostrawo*. Значыць павінна быць *Вострава*. Яшчэ на карце „Litwy i Rusi" выдадзенай у 1911 г. (адна) назва: *Ostrowo*. Дарэчы, я лічу, што *-ja* больш па-беларуску чым *-je*. Цяпер і формы тыпу *ў Белум Лузі, у леся* здаюцца мне *буольш* беларускімі („акаючымі") чым *у Белым Лузе, у лесе*.

Яраслаў Яновіч

* * *

Калі мяне памяць не падводзіць, дык назвы Паўночны і Паўднёвы Востраў прымяняліся ў „Ніве" ў той час, калі ў рэдакцыі працавалі Сакрат Яновіч і Міхась Хмялеўскі, асабіста звязаныя з апошняй вёскай; няёмка мне не ўлічваць такіх аўтарытэтаў. Дарэчы, на той момант, калі я знаёміўся з адгалоскай, у рэдакцыю з'явіўся згаданы ўраджэнец Паўднёвага Вострава — Міхась Хмялеўскі. І ён мне сказаў, што на месцы людзі карыстаюцца назвай *Востраў*. Дарэчы, калі б прымяняць мясцовыя назвы, дык невядома, колькі нашых чытачоў ведала б, напр., што гэта *Новая Вёска*.

Аляксандр Вярбіцкі

З месячнага боку

Дарагая Домна! Прыснілася мне, што я іду вуліцамі Варшавы і калі ўжо набліжаюся да Цэнтральнага вакзала, успыхае катастрофа, нешта як Чарнобыль. Забруджанасць паветра відавочная простым вокам, смурод. Людзі з маршу душацца, канаюць, а я тым часам знаходжу прыстанішча ў адрамантаваным пакоі ў сябры — толькі ўжо ў... Гродне. Аднак увесь час я думаю, як вярнуцца дадому, у Беласток. Пасля, калі паветра ачышчаецца, і я зноў іду ў напрамку вакзала, выступае вада з берагоў Віслы ці Нёмана і зноў нельга ехаць у Беласток, бо кажуць, што затапіла чыгуначныя рэйкі. Я вяртаюся да сябры, але там у пакоі многа вады. Я ляжу пад коўдрай і бачу, што вады мне ўжо пад шыю... але мне цёпла і нават бяспечна, я ведаю што не ўтаплюся. Галіна

Галіна! Ці ў часе, калі прысніўся гэты сон, у цябе была патрэба схавацца ад людзей, ад свету, каб адшукаць раўнавагу духа? Відаць, што хочаш на момант знікнуць, каб вярнуцца і спакойна ўжо кантактаваць са светам.

У пачатку варта звярнуць увагу на наваколле, дзе пабываеш. Той самы матыў у розных сітуацыях абазначае што іншае. Тваё месца на зямлі ў гэтым сне — Беласток. Гэта прыстанішча, эквівалент дому, дзе ўсё як хочаш, як любіш — проста адчуваеш сябе тут натуральна. Гэта мэта твайго падарожжа. Нават на карце Беласток знаходзіцца паміж Варшавай і Гроднам — у сне — тваёй блізкай тэрыторыі. Думаю, што Варшава гэта сфера афіцыйных кантактаў, хутчэй не датычаць яны кантактаў з блізкімі табе людзьмі. Паглядзі як мяняецца прасторавы сцэнарый: раз ты ў вялікім горадзе, раз у „інтымнай" правінцыі — а хочацца табе быць пасярэдзіне.

Каб зразумець гэты сон трэба ведаць, што падарожжа ў сне абазначае змены. У нашым выпадку Цэнтральны вакзал, гэта сімвал вялікай змены ў тваім жыцці.

Цяпер, разам пераедзем этапы твайго падарожжа, каб зразумець іх кампактна. Галоўнай тэмай тваіх сонных вобразаў ёсць камунікацыя. Не толькі твае сувязі са светам, але і з самой сабой.

З-за таго, што ў сне дамінуюць дзве стыхіі: паветра і вада, можна сказаць, што самыя істотныя для цябе мысленне і эмоцыі. Паветра гэта стыхія, якая датычыць інтэлекту, вада — сфера перажыванняў. Сон паказвае, што на двух гэтых узроўнях у цябе парваная раўнавага і гэта адлюстроўваецца ў тваім настроі і кантактах з людзьмі.

Сон можна падзяліць на два вобразы: найперш ёсць выбух, які атручвае паветра, пасля паводка. Абедзве гэтыя стыхіі перашкаджаюць табе дабрацца дадому. Так як важныя для нас вада і паветра, так без свабоднага настрою, думання і эмацыянальнай раўнавагі цяжка адчуваць сябе добра і жыць у згодзе з самім сабою.

Узрыў, які атручвае паветра і паводка — найбольшыя катастрофы. Праўдападобна ў тваім жыцці ёсць вялікая нервовая напружанасць. У сне відаць вялікі стрэс. Пра тваю сферу несвядомасці можна сказаць, што табе патрэбная як сапёр — у сне ўспыхае ўсё што небяспечнае на яве для твайго духа.

У такой сітуацыі кожны шукаў бы спосаб на так моцныя перажыванні, ім патрэбна адрэагавацца, каб далей жыць нармальна і не „ўспыхаць". Твой сонны спосаб гэта ўцёкі ў бяспечнае месца, у хату прыяцеля. Два разы робіш тое самае — хаваешся. Пад прыкрыццём чакаеш аж усё вернецца да нормы.

Падобна паводзіць сябе жывёла, якая зімой, у час непрыхільнай для сябе пары, хаваецца і засынае чакаючы вясны. А ў сувязі з тым, што цяжкія хвіліны, так як самая зіма, нармальныя справы, людзі выпрацавалі спосабы на перачаканне нядобрых дзён. Твой сон гэта рада — пачакай, не ўспыхвай — будзе лепш. Вада ўступіць на месца, паветра ачысціцца, а ты пасля гэтых досведаў глянеш на свет інакш і спакойна вернешся дахаты — значыць да сябе.

Домна (domnason@wp.pl)

Прызвычаіліся наракаць...

Набліжаецца зіма. Тым, хто вымушаны карыстацца чыгуначным транспартам раю не забываць пра кажух ды валёнкі. З ацяпленнем вагонаў бывае не найлепш. Падарожнічаў я 4 кастрычніка з Беластока ў Чаромху. У цягніку, які ад'язджаў у 8.45 былі два павярховыя вагоны. Першы, за лакаматывам, быў ацеплены. У заднім — зуб на зуб не пападаў. У купэ былі яшчэ два мужчыны. Перад ад'ездам далучыўся трэці, з чвэрткай гарэлкі. Паколькі не было ў іх ні кілішка, ні закусі, выпілі „з горла".

У час праверкі білетаў мае спадарожнікі прад'явілі прэтэнзію кіраўнічцы цягніка. Гэтая цынічна заявіла: „У першым вагоне цёпла. Маглі б вы перайсці ўперад".

Адзін з пасажыраў не стрымаўся.

— Вашым абавязкам прыняць цягнік у адпаведным тэхнічным стане ад рэвідэнта!

— А вы б толькі наракалі, — з'едліва адбуркнула кіраўнічка. Спадарожнікі, відаць, у законах разбіраюцца, таму давалі строгі выгавар кандуктарцы. Гэтая адно вачыма лыпала і, не сказаўшы нічога на развітанне, замармытала пад носам: „Прызвычаіліся наракаць..."

Уладзімір Сідарук

У Міхалоўскай гміне

Менш беспрацоўных

У гэтым годзе ў Міхалоўскай гміне лік беспрацоўных скараціўся на 110 чалавек. 30 асоб знайшло сабе працу ў Прадпрыемстве камунальнай і жыллёвай гаспадаркі ў Міхалове. Цяпер у ім працуе 45 чалавек. Некаторыя знайшлі занятак у міхалоўскай швальні (тут 60-асабовы рабочы калектыў).

Найбольш, аднак, людзей працуе ў Надлясніцтве Жэдня — 85 асоб. Існуюць яшчэ прадпрыемствы лясных паслуг і ў іх мае працу 150 чалавек. Яны садзяць лес, даглядаюць дрэўцы на пасадках і займаюцца высечкай дрэў. (яц)

Фота Аляксандра Вярбіцкага

Асфальт у Паўночным Востраве

Частку брукаванай вуліцы ў Паўночным Востраве — ад шашы з Беластока ў Крынкі ў напрамку Шудзялава — летась накрылі асфальтавым насцілам.

— І тратуары вам пакладуць? — пацікавіўся я ў пажылых жанчын, што выйшлі пасядзець пад восеньскім сонцам на лавачцы і паглядзець пры нагодзе на той прагрэс, які завітаў у іх вёску.

— Тратуары як хто сабе хоча, бо грошай не хапае, — адказалі мне. — Пакуль што засыплюць іх месца пяском.

І сапраўды, абнаўленне вулічнага насцілу адбываецца прыхваткава. Перад насцілам асфальтавага палотнішча з аднаго боку вуліцы кладуць бардзюры, а з другога — не. Бо на ўсё няма грошай. Але калі паклалі асфальт, крыху грошай зноў знайшлося і давезлі наступныя бардзюры — для другога боку вуліцы. Гміна (Шудзялаўская) стараецца: калі ласка, чым хата багата. Толькі хаты, якія там асталіся — небагатыя.

Аляксандр Вярбіцкі

Паталогія сярод моладзі

У Бельскім павеце штораз больш пагрозлівай грамадскай праблемай становіцца развіццё паталагічных паводзін дарастаючай моладзі. Ад студзеня да верасня г.г. Павятовая камендатура паліцыі ў Бельску-Падляшскім зафіксавала агулам 1 099 злачынстваў (дзеля параўнання: у 2000 годзе было іх 1 117), у іх ліку 85 каральных учынкаў, здзейсненых 45 непаўналетнімі асобамі. У большасці віноўнікамі былі хлопцы ва ўзросце 14-17 гадоў, бельскія гімназісты. У параўнанні з такім жа перыядам мінулага года лік злачыннасці непаўналетніх нязначна паменшаў.

Сярод найчасцейшых парушэнняў закону непаўналетнімі былі: 5 крадзяжоў чужой маёмасці, учыненых 12 віноўнікамі; 3 крадзяжы з узломам, учыненыя 7 віноўнымі; 6 разбояў з грабяжамі, учыненыя 3 непаўналетнімі; 3 уроны здароўю, учыненыя 4 віноўнікамі; 2 матэрыяльныя пашкоджанні, учыненыя 4 віноўнікамі.

У гэты перыяд наступіў рост наркатычнай злачыннасці, дзе зафіксавана 61 злачынства, учынена 7 віноўнікамі.

Расце п'янства; на працягу васьмі месяцаў выяўлена за дзесяць нецвярозых вучняў гімназій і сярэдніх школ. Піццё алкагольных напояў непаўналетнімі з'яўляецца вялікай праблемай і звязана яно з модай піцця піва, грамадскім дазволам і грэблівым стаўленнем да закону аб выхаванні ў цвярозасці і супрацьдзеянню алкагалізму. Сёлета бельская паліцыя правяла чатыры падрыхтоўчыя працэдуры супраць несумленных прадаўцоў, якія згандлёўвалі алкаголь непаўналетнім у гастараномах на тэрыторыі павета.

Бельская паліцыя вядзе дзейнасць у рамках г.зв. крымінальнай прэвенцыі, накіраваную на ўсведамленне дзецям і моладзі, ды і бацькам, пагрозы ад наркотыкаў, папяросаў і алкаголю. З пагрожанымі дэмаралізацыяй вучнямі вядуцца асцерагальна-засцерагальныя размовы і ў выпадках неабходнасці ладзіцца кантакт з Аддзелам сям'і і непаўналетніх Раённага суда ў Бельску-Падляшскім. Паліцыя праводзіць таксама курсы педагогам, у час якіх знаёміць з неабходнымі ў гэтай дзялянцы ведамі.

Галоўнымі перашкодамі ў змаганні з дэмаралізацыяй і злачыннасцю непаўналетніх з'яўляецца абыякавасць грамадства і саміх бацькоў да паталагічных паводзін моладзі. Праблемай з'яўляецца таксама адсутнасць суседскай насцярожанасці на хатняе насілле дарослых у адносінах да дзяцей, што вядзе да развіцця паталагічных паводзін у дарастаючай моладзі.

Міхал Мінцэвіч

Ніва — Тыднёвік беларусаў у Польшчы

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Чаму беларусу ніколі нельга зладзіць толку з палякам? Бо той апошні выпівае віно і не дапускае першага...

От, рэальная палітыка ў Беластоку.
Да стала даходзяць усе з кашолкай.
Ставяць на інаўгурацыі Сакрата,
Што ў Еўропу, каб сказаў, багата
Што — па-панску! — той хто меншы, і хто большы
Радасна ідзе народ усёй Польшчы.
Нашы, вашы — кожны ставіць вуха,
Бо Сакрата можна слухацца і слухаць.
Сталі потым хлебам-соллю частавацца.
А Сакрату па частунак — не дастацца.

Вандал Арлянскі

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Муж шукае свайго кашалька.
— У нагавіцах шукаў? — пытае жонка.
— Шукаў.
— А ў фрэнчы?
— Таксама.
— А ў плашчы?
— Не, бо баюся...
— Чаго баішся?
— Калі яго і там не будзе, тады не мінаваць мне сардэчнага прыступу.

* * *

Малы Янка гаворыць бацьку:
— У тае Веркі з суседняга дома ўжо дванаццаць дзяцей!
— І як яна сябе адчувае?
— У парадку, толькі падазраваю, што той яе бусел ледзь жыве.

* * *

Сустракаюцца два пенсіянеры:
— Як табе жывецца? — пытае адзін.
— Штораз горш. Уяві сабе, што нядаўна давялося мне прадаць два старыя вазоны.
— Немагчыма! А з якой яны эпохі?
— З тае эпохі, калі ў мяне былі яшчэ грошы.

* * *

— Пан доктар, — скардзіцца дзедка лекару, — дзень у дзень рэгулярна адаю мачу ў пяць гадзін.
— Гэта нармальна ў вашым узросце, — супакойвае яго лекар.
— Але я прабуджаюся толькі ў сем раніцы...

Адгаданка



1. парнакапытная жвачная млекакормячая жывёліна з галінастымі рагамі, 2. касіў канюшынку, 3. сталіца Афганістана, 4. з вялікай бывае малы дождж, 5. моцная залацістая гарэлка з ячменю, жыта або кукурузы, папулярная ў ЗША і Вялікабрытаніі.

(Ш)

Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлых клетках, чытаемых зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 36 нумара

Акіян, дах, жыла, камень, кіла, Кішка, куст, мех, папера, пена, піла, пуць.

Загадка: Маленькія лапкі, на лапках драпкі, ціхенька ступае, мышак пужае.

Рашэнне: **Кот.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Шварцэн-Яйцэн ды стапароз

Ну і дала мне сёння мая Агата з тае Амерыкі! Вядома, за што: не захацеў я лезці ў палітыку. Бы той дурань. Пабыла крыху за мяжой мая жонка і, бачыце, абсыпалася тою амерыканскаю пудраю. Невядома што будзе, калі вернецца. Пэўна, або мяне захоча памяняць, як у той рэкламе, што жонка памяняла мужа на лепшага змяніўшы яму дыету (каб панізіць яму халестэрын), або і зусім? А раптам возьме ды зусім мяне памяняе?! З тымі амерыканкамі, таго, ведаеце, як ёсць — усе ж глядзіце амерыканскія „Дынастыі" — мяняюць мужыкоў як пальчаткі, у нічым ім не дагодзіш. Найлепш каб грошы такі меў. Проста — мільянер. Так і кажу Агаце: адчапіся. Я небагаты, і не такі малады, каб за палітыку брацца, і мала што ў нас Еўропа, не Амерыка, а простая Польшча. А яна:

— Шварцэн-Яйцэн такі вось у іх ёсць, у губернатары яго выбралі, а сам ён з маленькае Аўстрыі...

— Але сам ён аграмадзіна такая, з касмічнымі пачварамі змагаўся... Ды і жонка ў яго не ты, Агата, а Марыя, сваячка Кенедзі.

— У Амерыцы кожны можа зрабіць кар'еру, — бачу, што маёй Агаце ўжо дакладна прапаласкалі за акіянам мазгі.

— То што, можа, прыехаць мне туды, да цябе, каб даць шанц сабе ды амерыканцам пазнаць мае магчымасці? — удаў я запал. — Прыляцець. Далез бы я да цябе, мілая, на сваіх дваіх, ды ногі штосьці пабольваюць... І канец з палітыкай, калі штосьці страляе ў касцях.

— Мо ў цябе стапароз? — спалохалася Агата. — Ідзі, правер. Гэта калі з касцей рэшата робіцца. Не толькі гэта бабская справа.

От, разумная зрабілася мая Агата яшчэ больш чым была.

Пайшоў я праверыць свае косці, што зробіш. Прайшоў усе дарогі, ад „лекара першага кантакту". А тэхнік, сын майго знаёмага журналіста, што нядаўна напісаў кнігу „Трэснутыя колам фартуны" (я гэтак пераклаў *Trafieni przez Fortunę*), аж качаецца ад смеху ў сваім кабінеце.

— Чаго, Ясь, рагочаш? Можа, і ты трапіў „шасцёрку" ў Таталётак? — запытаўся я і наставіў правую руку да ягонага апарата.

— Ездзіў я мераць па вёсках ды мястэчках шчыльнасць касцей насельніцтва, — раптам пасур'ёзнеў тэхнік. — Трапіў я ў Дзядковічы...

— Ведаю, ведаю гэтую вёску, там у мяне была калісьці нарачоная, Крыся, — прызнаўся я з сантыментам ды ўздыхнуў. — Не захацела за мяне ісці...

— Стаіць, вось, тамака чарга насельніцтва, — далей без усмешкі распавядае тэхнік ды бярэцца за маю руку. — Пытаюся ў дамы: „Пані праваручная?.." А тая ў жаху, робіцца то пурпуровая, то спалатнелая, і раптам як не крыкне: „Я-я??!! Я — ка-та-лі-чка-а!!!"

Я аж падскочыў. А малады тэхнік спраўна памераў на маёй правай руцэ ўзровень трываласці маіх балючых касцей.

— Я спачатку слова не мог з сябе выдушыць: чаго яна хоча. З паўхвіліны прайшло, пакуль дапяў. „Ага, вы якой рукой пішаце?" — „Правай!" — супакоілася пані Крыстына.

Ага! Яна! А, можа, не яна... Тады таксама хтосьці спурпуравеў, калі даведаўся, што я... не пішу левай рукой. Гэта была Крысіна маці. Ды, каб не тое, ці меў бы я Агату, якая хоча каб я стаў амбітным палітыкам? Каб па-амерыканску лавіў свой шанц?

Вандал Арлянскі

Чаканне Рыся Кілера

У лесе Сандара Жоржавіча запанавала амаль святочная прыўзнятасць. Вось, упершыню ад шасці вёснаў меў прыбыць сюды знакаміты госць з суседняга Заходняга лесу — Рысь Кілер. У апошні час над мядзведжым лесам праляталі толькі ластаўкі, так сказаць, нізкага палёту. А тут, на табе — такі госць!

Асабліва старанна рыхтаваліся да таго візіту сяброўкі ўселяснога кіраўніцтва. Лань Гаўрусіха колькі гадзін раней дакладна вылізвала путавыя костачкі. Вавёрка Кацюша чухалася кітай аб сасну, ганарліва настабурчваючы кожную валасіну. Барсук Барушчук, хоць не сябра, а ўсё ж прадстаўнік кіраўніцтва, плаўным рухам, за сонцам, выціраў мызу ў мох, выдзіраючы ад тыдняў застылую там гразь. Гадзіну да пачатку планаванага візіту кіраўніцтва сустрэлася на паляне на адмысловай нарадзе.

— Вось, прыязджае да нас не абы-хто, — прамовіў Сандар Жоржавіч. — Дзякуючы яму ўсе даведаюцца, што і мы не абы-якія, а такія, што го-го! Трэба паказацца.

Барушчук, узрушаны падзеяй, нават на момант не адарваў мызы ад імху, выпінаючы тую частку цела, якая завяршае барсуковы заднія лапы.

— А вы, Барушчук, ужо так застанецеся?! Разумею, што вы хочаце паказаць Рысю тое, што ў вас найлепшае?! — злосны мядзведзь рашыў спыніць ранішні барсуковы туалет.

— А-я-яй! Я... самазабыўся. Я ж не хацеў, ай, у галаву мне такое і не прыйшло! — ачнуўся спалоханы барсук, якому, дарэчы, у галаву нічога ніколі асаблівага не прыходзіла, як і цяпер.

Мядзведзь працягваў:

— Сонца паказвае, што праз момант укрочыць на нашу паляну шаноўны Кілер. Станавіцца ў рад! Не дыхаць!

Кіраўніцтва замерла без дыху і руху, наслухоўваючы крокаў з заходняй часткі лесу. Сонца ўсё вышэй перасоўвалася па небе. Лань зрабілася, урэшце, бледна-чырвоная. Паспела толькі падумаць: „Я ж не рыба?!"

Ну дый і не стрывала. Як і вавёрка, заяц ды барсук, папярхнулася паветрам. Рысь не прыбыў.

— Нешта тут не так! — кінуў неспакойна Сандар Жоржавіч, калі сонца схавалася за дубам. — І зноў будуць казаць, што мы сякія-такія ды абы-якія. Я Рысю такога не дарую!

Расчараванае ды перапоўненае жалем кіраўніцтва разышлося па лесе.

Тым часам з аднаго з узлескаў дабягалі галасы шчырых прызнанняў, паразумення і банкетавання. Гэта змяя Ссапія, вуж Ззянон і дзік Свіналыч прымалі Рыся Кілера. Сустрэлі яго, калі падаваўся на паляну. Загаварылі яму зубы і быццам выпадкова ўсе звярнулі ў іхны ўзлесак. Рысь хваляваўся ад прызнанняў, падтрымліваў паразуменнем і зусім самазабыўся ад тае бяседы.

МакХолад

ISSN 0546-1960